Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Неабкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапіраэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапіраэлі пасьлі тэксту 1 р. — к. За радок шапіраэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. дарожэй. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Бесплатныя і чырвонаармейцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх адзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

НОШТ НУМАРУ 5 кап.

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 219 (2407) Субота, 22-га верасьня 1928 г.

На III Сэсіі ЦВК БССР VIII скліканьня.

Сёньня, 22 верасьня, а 11 гадзіне раніцы ў памяшканьні клюбу імя Карла Маркса адбудуцца пасяджэньні камісій III Сэсіі ЦВК БССР па распрацоўцы праэктаў пастаноў: а) па дакладу Камісарыяту Сацыяльнай Забясьпекі і садакладу ЦК Сялянскіх Т-ваў Узаемадапамогі і б) па дакладу аб Крымінальным Кодэксе БССР.

А 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні Прэзыдыуму ЦВК адбудзецца нарада сялян і сялянак—членаў ЦВК БССР —дзеля абгаварэньня праэкту Саюзнага закону аб асновах земляўпарадкаваньня і землякарыстаньня.

САКРАТАР ЦВК БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

Забясьпечаньне хлебам.

Не зважаючы на рост хлебазагатовак, мы маем яшчэ ў забясьпецы хлебам асобных спажываючых раёнаў некаторыя перашкоды. Прычыны іх нагатоўкі добра вядомы, што каўрад ці трэба пра іх ізноў гаварыць. Напомнім толькі галоўнае: зьмены геаграфіі ўраджаю, а іменна перасоўка яго на ўсход, у раёны далёкія ад спажыўца; запозьненае жніво ў зьвязку з пагоршаньнем надвор'я ў канцы лета; пагоршаньне ярыны ў паўднёвых раёнах. Да прычын аб'ектыўных трэба далучыць яшчэ недахопы загатоўчага і дастаўляючага апарату, якія часта ўскладняюць становішча.

Аднак, усім гэтым недахопам процістаўляецца асноўнае спрыяючае становішча, наліччa ў радзе раёнаў добрага ўраджаю, наліччa хлеба ў колькасьці, якою можна поўнасьцю здавольніць патрэбы краю.

Якія-б ні былі вялікія цяжкасьці падвозу хлеба з далёкіх пунктаў, але гэтыя цяжкасьці пры напружанай і энэргічнай працы ўсіх савецкіх апаратаў лёгка перамагчы. Рост загатовак зьяўляецца довадам таго, што перашкоды зжываюцца і будуць пераможаны.

Галоўным адноўным зьвяшчам, якога мы нездольны былі зьвяшчыць, быў малы падвоз хлеба ў асобныя пункты ў першыя месяцы загатовак. Далей, на нас усклалася вельмі адказная задача забясьпечыць засеў поля для ўраджаю будучага году. Вялізнае значэньне мае дапамога пацярпеўшым раёнам.

Выканаўшы на[illegible] абавязк[illegible] ў галіне адгрузкі насеньня, разгарнуўшы загатоўкі, падцягваючы хлеб да станцый і млыноў, мы набываем магчымасьць значна палепшыць забясьпечаньне хлебам галоўныя катэгорыі спажыўцоў, у першую чаргу рабочых. Але, каб дасягнуць такіх вынікаў, трэба вялікая напружанасьць усіх сіл, удзельных у працы апаратаў, і самая актыўная дапамога ўсіх грамадзкіх партыйных і рабочых арганізацый. Нам належыць яшчэ перамагчы, папершае, недахопы загатоўчага апарату: нездаровыя формы канкурэнцыі між кааперацыяй і «Саюзхлебам», выпадкі няправільнага прыстасаваньня кандыцый пры прыёмцы хлеба ад сялянства, недахват памяшканьняў для сховы збожжа і інш.

Мы павінны зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на тое, што загатоўчыя апараты кульгаюць у шмат-якіх галінах працы. Сур'ёзныя недахопы ёсьць і ў разьмеркаваньні таварных мас. Выпраўка гэтых недахопаў значна пасуне наперад справу дастаўкі хлеба спажыўцу.

Адначасна трэба навучыць усе арганізацыі, праз якія праходзіць хлеб, самым ашчадным адносінам да яго: забясьпечыць добрае месца для сховы; уважліва выконваць правілы мліва; выпякаць хлеб добрае якасьці,

Пры энэргічным выкананьні ўсіх намечаных мерапрыёмстваў дастаўка хлеба спажыўцу будзе бясспрэчна, забясьпечана.

ДЫКТАТУРА ФАШЫСЦКАЕ ПАРТЫІ У ІТАЛІІ ЎЗАКОНЕНА.

РЫМ, 20-9. Вялікая рада фашысцкае партыі ўхваліла праэкт, згодна якога яна абвяртаецца ў адну з вышэйшых урадавых устаноў. У кампэтэнцыю вялікае рады ўваходзіць, між іншым, наступнае: права рашаючага голасу належыць вялікай радзе па пытаньнях аб складаньні сьпісу кандыдатаў на парляманцкіх выбарах, аб зьмене статуту і палітычных дырэктыў фашысцкае партыі, аб назначэньні сэкратара і сяброў дырэкцыі фашысцкае партыі; адначасна праэкт устанаўляе, што сэкратар і сябры дырэкцыі фашысцкае партыі афіцыйна назначаюцца дэкрэтам прэм'ера; па іншых пытаньнях вялікая рада мае дарадчыя правы, прычым пытаньні аб зьмене канстытуцыі павінны абавязкова пагоджвацца з думкаю рады. Далей, згодна праэкту, вялікая рада загадзя намячае кандыдата на выпадак, калі пасада прэм'ера будзе вольнаю, і гэты кандыдат ідзе на зацьверджаньне караля, як і сьпісы кандыдатаў на іншыя адказныя дзяржаўныя пасады.

ПАВАРОТ ДА ЦАНКОУШЧЫНЫ.

РАБОЧАЙ ПАРТЫІ ПАГРАЖАЕ РАЗГОН.

ВЕНА, 20-9. Як ведамляе сафійская газэта «Зора», баўгарскае міністэрства ўнутраных спраў дазволіла назначаную на 16-га верасьня дэлегацкую канфэрэнцыю рабочае партыі пры ўмове, што ў канфэрэнцыі возьме ўдзел толькі 30 дэлегатаў. Аднак, не зважаючы на дазвол міністра, канфэрэнцыя была забаронена паліцыяй.

Урадавы друк ня спыняе цкаваць рабочую партыю, называючы яе толькі «прыкрыцьцём» камуністычнае партыі, і патрабуе яе роспуску.

АРЫШТ СЯБРОЎ РАБОЧАЕ ПАРТЫІ

ВЕНА, 20-9 Як паведамляе орган баўгарскае сацыял-дэмакратыі «Народ», сафійская паліцыя арыштавала ашчэ 9 чалавек у зьвязку з выкрытаю ёю нібыта нелёгальнай камуністычнай арганізацыяй.

ЦК рабочае партыі агаласіў паведамленьне ў прасе з пратестам проці абінавачаньняў, высунутых паліцыяй, [illegible] удзелу рабочае партыі ў дзейнасьці нелегальных арганізацый.

Непарадкі ў Вэнецуэле.

НЬЮ-ЁРК, 20-9. З Калюмбіі і іншых месц паведамляюць, што ў Вэнецуэле ўзьніклі сур'ёзныя непарадкі. Урадавая цэнзура не прапушчае за мяжу ніякіх вестак аб непакоях.

Галодныя бунты ў Бэсарабіі.

ВЕНА, 20-9. Бэсарабскі карэспандэнт газэты «Аргус» паведамляе, што бэсарабскае жыхарства знаходзіцца ў выключна цяжкім становішчы ў выніку неўраджаю; становішча абцяжарана спагнаньнем уладаю падаткаў і драпежніцтвам вясковых багацеяў.

У Татарбунале ўжо выбухнулі сялянскія непакоі. Сяляне наскочылі на харчовыя склады ў маёнтках некалькіх аколічных абшарнікаў і падзялілі харч між сабою.

Саюз 2-х охранак.

БЭРЛІН, 18-9. З Бэрну паведамляюць, што ЦК швэйцарскае кампартыі агаласіў адозву наконт гвалту над Чэзарэ Росьсі (італьянскі антыфашысцкі эмігрант, які быў скрадзен агентамі італьянскае паліцыі на швэйцарскай тэрыторыі). Адозва заклікае швэйцарскіх рабочых наладжваць усюды мітынгі і дэманстрацыі пратэсту проці парушэньня права прытулку і проці патураньня дзейнасьці фашысцкіх агентаў на тэрыторыі Швэйцарыі.

Ліга Нацый канчаткова пахавала разброеньне.

Склік падрыхтоўчае камісіі адцягваецца на гады.

ЖЭНЕВА, 20-9. Не зважаючы на зацяжныя спрэчкі ў камісіі Лігі Нацый па пытаньнях разброеньня і бэзапаснасьці, а таксама на зацяжныя нарады рэдакцыйнага намітэту гэтае камісіі, яна ня ўхаліць нічога станоўчага па пытаньні аб скліку падрыхтоўчае камісіі да канфэрэнцыі аб разброеньні, а таксама аб скліку самое канфэрэнцыі. Галоўная прычына няўдачы—незамірымасьць лёрда Кешэндэна, які рашуча супярэчыў проці можнага хоць прыблізнага назначэньня часу скліку падрыхтоўчае камісіі. Водлуг вестак з пэўных крыніц, Кешэндэн заявіў, што назначаць час—бязглузьдзіца, і спасылаўся на нежаданьне Амэрыкі ўдзельнічаць у падрыхтоўчай камісіі, пакуль ня будзе вырашана пытаньне аб абмежаваньні марскіх узброеньняў, а таксама на надыходзячыя ў некаторых краёх (у тым ліку ў Англіі) парляманцкія выбары.

Поль Боннур (які прапанаваў у пачатку, каб час скліку падрыхтоўчае камісіі быў назначан у канцы 1928 году або ў пачатку 1929 г.) саступіў Кешэндену і заявіў, што бяз згоды між марокімі дзяржавамі „склін падрыхтоўчае камісіі ня мае сэнсу". У зьвязку з гэтым Поль Боннур зьмяніў пададзены ім праэкт рэзалюцыі; новы праэкт дае права старшыні падрыхтоўчае камісіі Лёўдону скліканць сэсію камісіі калі ён будзе лічыць патрэбным, прычым яму даручаецца загадзя пагадзіць пытаньне з адпаведнымі ўрадамі, між якімі існуе найбольшая супярэчнасьць» (г. зн. марскімі дзяржавамі.

Водлуг вестак, Барнсдорф заявіў, што нямецкая дэлегацыя ня здолее галасаваць ні ў камісіі, ні на пленуме Лігі Нацый за такую рэзалюцыю. У такім разе ўхвалёная пленумам рэзалюцыя будзе лічыцца не пастановаю, а толькі «пажаданьнем», бо для ўхвалы рэзалюцыі, якая мае характар пастановы, патрэбна аднадзгоднасьць. Вельмі магчыма, што разам з нямецкай дэлегацыяй будуць галасаваць нарвэжцы, вэнгерцы і, магчыма, прадстаўнікі некаторых іншых малых дзяржаў.

Нямецкая дэлегацыя зазначае, што па сэнсу новага праэкту рэзалюцыі Боннура, склін падрыхтоўчае камісіі можа зацягнуцца да перагляду Вашынгтонскае канвэнцыі аб абмежаваньні ўзброеньняў, г. зн. да 1931 году.

ЗАТРЫМКА ЗА „ДОБРАЮ ВОЛЯЮ".

БРЫЯН АБ РЭПАРАЦЫЯХ І ВЫЗВАЛЕНЬНІ РЭЙНСКАЕ ВОБЛАСЬЦІ.

БЭРЛІН, 20-9. Брыян у гутарцы з жэнеўскім карэспандэнтам „Франкфуртэр Цэйтунг" заявіў: «Рэпарацыйная праблема не датычыць Амэрыкі, бо даўгі, як і раней, будуць ёй выплачвацца. Калі была-б добрая воля абодвых бакоў, дык рэпарацыйнае пытаньне можна-б было ўпарадкаваць за некалькі тыдняў. Пасьля гэтага зараз-жа магла-б адбыцца поўная эвакуацыя Рэйнскае вобласьці».

НЕДАВЕРЧЫВАСЬЦЬ У НЯМЕЧЧЫНЕ ДА АПОШНЯЕ ЗАЯВЫ БРЫЯНА.

БЭРЛІН, 20-9. У палітычных колах аптымістычныя заявы Брыяна наконт франка-нямецкае згоды выклікалі скептычную ацэнку. Нават «Форвэртс» лічыць гэты аптымізм некалькі дзіўным, асабліва з прычыны таго, што Брыян спрошчана выкручваецца ад пытаньня наконт дапамогі Амэрыкі ўпарадкаваць рэпарацыйную праблему. Водлуг слоў газэты, удзел амэрыканскага фінансавага капіталу неабходзен для ўпарадкаваньня нямецкага доўгу.

Інтэрв'ю Залескага.

ВАРШАВА, 20-9. Перад выездам з Жэневы Залескі даў інтэрв'ю карэспандэнту афіцыёзу „Эпока". Наконт польска-літоўскіх перамоў Залескі сказаў: „У мяне стварылася ўражаньне, што мы ізноў зрабілі крок наперад. Усё больш узмацняецца думка, што наш мэтад цярпілівага чаканьня павінен даць пажаданыя вынікі".

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

УСЕАГУЛЬНАЯ СТАЧКА ЛЁДЗІНСКІХ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ.

ТРЫВОГА Ў УРАДАВЫХ КОЛАХ.—ПЭПЭЭСАЎСКІЯ ПРАФСАЮЗЫ ВОСТРАЦЬ НОЖ У СЬПІНУ ЗАБАСТОЎШЧЫКАЎ.

ВАРШАВА. 20-IX, Канфлікт між лёдзінскімі тэкстыльшчыкамі і прадпрыёмцамі з-за новае сыстэмы штрафаў абярнуўся ва ўсеагульную забастоўку тэкстыльшчыкаў. Забастоўка распачалася сёньня раніцою. Як паведамляюць з Лёдзі, агульны лік бастуючых дасягае 40 тысяч чал.

На некаторых прадпрыёмствах адначасна з патрабаваньнем скасаваць штрафы высунуты некаторыя эканамічныя патрабаваньні.

Газэты пішуць, што камуністы спрабуюць выкарыстаць забастоўку з палітычнаю мэтаю, дзеля чаго ў Лёдзь прыехала некалькі камуністычных дэпутатаў сойму. Усходняе агэнцтва паведамляе, што на сходзе фабрычных дэлегатаў ППС'аўскага саюзу тэкстыльшчыкаў камуністы пры галасаваньні рэзалюцыі атрымалі абсалютную большасьць.

У вязку з забастоўкаю прэм'ер Бартэль выклікаў да сябе міністра ўнутраных спраў і міністра працы. Як відаць, урад рыхтуецца ўмяшацца ў забастоўку і прапанаваць арбітражнае разьвязаньне канфлікту.

Прафсаюзы, якія знаходзяцца ў руках ППС і нацыянальнае рабочае партыі (НПР), паслалі міністру працы мэмарандум з патрабаваньнем умяшацца ў забастоўку, каб недапусьціць да ўсеагульнае забастоўкі. Такім парадкам, рэфармісцкія прафсаюзы ня толькі ня кіруюць забастоўкаю, але ўжо ў самым пачатку просяць урад аб пасрэдніцтве, загадзя будучы гатовымі на розныя ўступкі.

Верхнясілескім гарняком пагражае лёкаут.

ВАРШАВА, 20-9 Уласьнікі вугальных капальняў Верхняе Сілезіі адхіляюць арбітражную пастанову павялічыць заработак гарняком на 4-9 проц. і пагражаюць лёкаутам.

Прыгавар па справе „Грамады" ўжо разасланы.

„Слово" (№ 204) паведамляе, што прыгавар па справе «Грамады» ва ўматываванай форме разасланы ўжо заінтэрасованым асобам 17 верасьня г. г. «Слово» кажа, што і з боку пракураў і з боку абароны засуджаных будуць паданы апэляцыйныя скаргі на прыгавар.

Тэрмін справы ў апэляцыйным судзе яшчэ ня вызначаны, аднак, як прыпушчае «Слово», разгляд справы адбудзецца ў сакавіку 1929 году.

Дэпутату-украінцу Заходнаму не дазволена паехаць ў СССР

ВАРШАВА 19-IX. Польская ўлада адмовіла дэпутату сойму Заходнаму, сябру украінскае парты працы выдаць заграничны пашпарт для падарожжа ў СССР.

СУД НАД КАМУНІСТАМІ Ў МАЛАДЗЧНЕ.

Віленскі акруговы суд на выязной сэсіі ў Вялейцы разглядаў справу жыхароў Маладэчна: П. Данкевіча, М. Ганіча, Я. Мордуса, І. Ганіча, К. Пальчэўскага, У. Ганіча, Я. Цыбульскага і Ф. Юрэвіча, абвінавачаных у перавозе з БССР у Польшчу камуністычнай літаратуры. Суд прыгаварыў П. Данкевіча на 6 гадоў астрогу, М. Ганіча на 5 г., Я. Мордуса на 4 г., Я. Ганіча і К. Пальчэўскага на 2 г. Іншых апраўдаў.

„БАЛЬШАВІК".

«Кур'ер Віл.» (№ 213) паведамляе, быццам газэта пад такою назвою рассылаецца па вёсках З. Беларусі ў досыць паказны ліку. Рассылаецца яна ў заклееных канвэртах і быццам накіроўваецца да давераных асоб кампартыі Зах. Беларусі. Частка тэксту друкуецца на беларускай, а частка на расейскай мове. Аўтары артыкулаў быццам ня скрываюць сваіх сымпатый да СССР.

Напад на капрала ў лідзкім астрозе.

Гэтымі днямі ў часовым вайсковым астрозе ў Лідзе два вязьні: Шышлаў і Казяркевіч накінуліся на ключніка капрала Замойду, з мэтаю разброіць яго. Напад на Замойду зроблен быў у момант, калі ён адчыняў дзьверы іх пакою. Замойда выстраліў і параніў Шышлава ў левы бок.

Арышты падпальшчыкаў.

«Дзеньнік Віл.» (№ 213) паведамляе, што адміністрацыя арыштала ў вёсках Харнеўцы, Пубінкі і Івенцы пейкіх: У. Фарунчука, Ю. Уладоўскага і І. Манчуна, абвінавачваючы іх у шматлікіх падпалах і ў тым, што яны мелі цесны кантакт з тэрарыстычнай арганізацыяй «Жалезная рука», якая апэравала галоўным чынам у Лідзкім і Стаўпецкім паветах.

Паход аўстрыйскіх фашыстаў на Вену.

ВЕНА. «Нэйе Вінэр Тагеблят» паведамляе аб пачатку перамоў між прадстаўнікамі ўлады і лідэрамі сацыялдэмакратычнае партыі наконт забесьпечаньня спакойнага ходу маніфэстацыі арганізацый «Хейвэру», якая наладжваецца 7-га кастрычніка ў Вінэр-Нойштадт. («Хеймвэр» — рэакцыйная баявая арганізацыя). Пры гэтых перамовах улада дамагаецца, каб сацыялдэмакраты адмовіліся наладзіць рабочыя маніфэстацыі, якія павінны адбыцца ў Вінэр-Нойштадт у гэты самы дзень.

Погляд сацыял-дэмакратаў на гэтую прапанову пакуль-што невядомы.

Як паведамляе „Роте Фанэ", гэтымі днямі ў Вене адбылася нарада прадстаўнікоў фабрычна-заводзкіх камітэтаў і левых рабочых арганізацый, якая ўхваліла склікаць 30-га верасьня ў Вінэр-Нойштадзе дэлегацкую канфэрэнцыю рабочых арганізацый, каб абмеркаваць пытаньне наконт захадаў перашкодзіць маніфэстацыі «Хеймвэру».

У Саюзе ССР.

150 новых фабрык збожжа.

ПРАГРАМА БУДАЎНІЦТВА САВ. ГАСП.

МАСКВА, 20-IX. На пленуме ЦК саюзу сельска-гаспадарчых рабочых быў заслухан даклад старшыні праўленьня збожжатрэсту аб будаўніцтве новых савецкіх гаспадарак.

Збожжатрэсту будзе перададзена **5 міліёнаў гэктараў зямлі для арганізацыі 150-ці савецкіх гаспадарак.** *Зямля будзе дадзена на Паўночным Каўказе, у Ніжнім і Сярэднім Паваложжы, на Урале, Казакстане, Сібіру, Украіне і ў Крыме.*

Кантрольныя лічбы **на 1928-29 год прадугледжваюць пабудову 50-ці савецкіх гаспадарак** *на Паўночным Каўказе, у сярэднім і ніжнім Паваложжы, на Урале, і Сібіру, Казакстане, Крыме і на Украіне. На пабудову і абсталяваньне гэтых савецкіх гаспадарак будзе выдадзена* **100 міліёнаў рублёў.**

Для кожнае савецкае гаспадаркі ў 30-50 т. гэктараў зямлі патрэбна будзе блізка 300 пастаянных рабочых і служачых.

У 1929 годзе будзе арганізавана на Паўночным Каўказе спэцыяльная дасьледча-паказальная вучэбная савецкая гаспадарка, дзе пад кіраўніцтвам выдатных чужаземных спэцыялістаў сельскае гаспадаркі будуць падрыхтоўвацца кадры працаўнікоў для новых савецкіх гаспадарак.

Створым кадр інжынэраў для фабрык збожжа.

Пастанова ЦК УсеКП(б).

МАСКВА. Наліччых кадраў для будаўніцтва і кіраваньня працаю ў буйных, у першую чаргу збожжавых савецкіх гаспадарках не хапае для пабудовы гаспадарні на аснове найноўшых дасягненьняў навукі і тэхнікі.

ЦК УсеКП прызнаў патрэбным з сёлетняга навучальнага году паставіць на чаргу вышэйшым тэхнічным навучальным установам, тэхнікумам, а таксама спэцыяльным курсам падрыхтоўку гэтых кадраў. ЦК лічыць патрэбным, каб народныя камісарыяты асьветы саюзных рэспублік в 1928 году арганізавалі ў вышэйшых навучальных установах асобныя цыклы, якія рыхтавалі-б спэцыялістаў для буйных збожжавых савецкіх гаспадарак, і ўвялі адпаведныя дыцыплінны ў вучэбныя планы сумежных з гэтай спэцыяльнасьцю факультэтаў і аддзяленьняў.

Для найбольшай сувязі школы з буйнымі сельска-гаспадарчаю вытворчасьцю ЦК прызнаў патрэбным увесьці для падрыхтоўкі спэцыялістаў буйнае сельскае гаспадарку абавязковую вытворчую практыку на менш 12-ці месяцаў у працягу ўсяго часу навучаньня; з весны 1929 году прэзыдыюм студэнтаў арганізаваць пры спэцыяльна вылучаных збожжатрэстах савецкіх гаспадарак.

Чыгуначныя майстэрні на 7-мігадз. дзень

МАСКВА. Між ЦК саюзу чыгуначнікаў і НК Шляхаў дасягнута згода аб пераводзе на 7-мігадзінны дзень варонескіх, мурманскіх, тамбоўскіх, астраханскіх, днепрапятроўскіх і ніжнеднепроўскіх чыгуначных майстэрняў. Сьпіс будзе пададзен на зацьверджаньне ва ўрадавую камісію.

Апроч таго, намечаны да пераводу на сямігадзінны дзень яраслаўскія майстэрні, «Пролетарский Завод» і майстэрні аддзелу сувязі Паўднёва-Заходніх чыгунак.

Памяці 26-ці бакінскіх камісараў.

АСХАБАД. 20-9. У зьвязку з 10-мі ўгодкамі расстрэлу ангельскімі інтэрвэнтамі 26-ці бакінскіх камісараў, учора ў Асхабад прынхала дэлегацыя бакінскіх рабочых і Азэрбайджанскага ўраду. Дэлегацыя выяжджала на месца расстрэлу. Туды-ж езьдзіла дэлегацыя ЦВК Туркмэнскае ССР. У прысутнасьці абедзьвюх дэлегацый, а таксама сяброў кангрэсу Камінтэрну, на месцы расстрэлу адбыўся мітынг і закладка помніку.

Нафтаправод Касьпійскае мора—Масква.

МАСКВА, 20-9. Самым буйным цэнтрам ужываньня кафтавых прадуктаў у СССР зьяўляецца Масква, якая патрабуе штогоду блізка што паўтара міліёны тонн. Між тым, нафтаперагонныя заводы ў СССР знаходзяцца, пераважна, у раёнах здабычы нафты. Перавозка сыроё нафты і прадуктаў у спажываючыя цэнтры па чыгунках і рэчках каштуе вельмі дорага. Самы танны транспарт—марскі, але ў нашых умовах ім можна карыстацца на вельмі малой адлегласьці. У зьвязку з гэтым нафтавы дырэктарат узьнімае пытаньне аб пабудове нафтаправоду Касьпійскае мора—Масква (прыблізна 2 тысячы вёрст). Адпраўнай станцыяй для нафтаправоду мяркуецца абрать адзін з паўночных пунктаў узьбярэжжа Касьпійскага мора. Адгэтуль нафтаправод намячаецца вростым напрамкам да Масквы. Арыентыровачна кошт пабудовы такога нафтаправоду абойдзецца блізка 80-ці міліёнаў рублёў (нафтаправод Баку—Батум на адлегласьці 800 вёрст каштаваў 44 міліёны рублёў).

Рашучы паход на прагулы.

ЛЕНІНГРАД, 18-9. Для барацьбы з прагуламі Ленінградзкі тэкстыль разам з саюзам тэкстыльшчыкаў абвяшчае спэцыяльны конкурс на тэму «у кого менш прагулаў». У конкурсе будуць удзельнічаць ня толькі фабрыкі, але і асобныя цэхі. Такі конкурс праводзіцца ў Ленінградзе ўпершыню.

Дэманстрацыя дзяцей проці п'янства бацькоў.

РЫБІНСК, 20-IX. На Ліцейнай фабрыцы дзеці наладзілі дэманстрацыю проці п'янства бацькоў. А 5-й гадзіне ўвечары дзеці арганізаванымі радамі падыйшлі да брамы фабрыкі ў той момант, калі рабочыя выходзілі з фабрыкі. Ля брамы быў наладжан лятучы мітынг.

Рабочыя адгукнуліся на заклік дзяцей і ўхвалілі зачыніць краму Цэнтрасьпірту.

СПРАВА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЬЦЯЎ У ЛІЗЕ НАЦЫЙ.

Пасьля сусьветнай вайны амаль ня ўвесь капіталістычны сьвет аб'яднаўся ў спэцыяльна створаную арганізацыю пад назваю «Ліга Нацый», заданьнем якой зьяўлялася не дапусьціць новых ваенных канфліктаў і сьцерагчы недатычнасьць новых дзяржаўных граніц, узьніклых у рэзультаце Вэрсальскага міру. Адначасова амаль ня ўсе новаўтвораныя дзяржавы павінны былі падпісаць дадатковы да Вэрсальскага трактару акт аб правах нацыянальных меншасьцяў, якія ўвайшлі ў склад іх дзяржаўных арганізмаў.

Усімі гэтымі мерапрыёмствамі капіталістычны сьвет хацеў загарантаваць сябе ад новай крывавай вайны, якая столькі гадоў вялася між іншым і з-за нацыянальнага ўціску імпэрыялістычнымі дзяржавамі прыгнечаных імі народаў. Здавалася, што запануе мір, згода і братэрства і згіне ўсякі ўціск слабейшага дужэйшым. Аднак, ішлі гады і прыгожыя пастановы трактатаў усё больш і больш выцьвіталі і амаль ня зусім урэшце забыліся. Паводзіны Англіі і Японіі ў Кітаі, Англіі ў Эгіпце і іншых калёніях, Францыі і Гішпаніі ў Мароко сьведчаць аб тым, што правадыры Лігі Нацый ня лічаць сябе зьвязанымі ніякімі пастановамі, калі справа ідзе аб іх імпэрыялістычна-капіталістычных інтарэсах.

Што-ж гаварыць тады аб якіхсьці нацыянальных меншасьцях? Мы добра ведаем становішча як калёніяльных народаў, так і нацыяналасьцяў, асабліва тых, якія пражываюць у межах нашых суседзяў. Мы ведаем таксама, што прадстаўнікі нацыяналасьцяў, прыгнечаных дзяржаўнымі нацыямі, зьбіраліся ўжо тры разы на канфэрэнцыі, каб на іх абгаварыць свае балючыя справы і потым запратэставаць перад Лігай Нацый проці невыкананьня некаторымі дзяржавамі падпісаных імі актаў аб правах нацыяналасьцяў. У гэтым годзе—якраз перад самаю сэсіяй Лігі Нацый—у Жэневе адбыўся трэці зьезд прадстаўнікоў нацыяналасьцяў пераважна эўрапейскіх дзяржаў. Зьезд прыняў зваг пастановаў, зьвернутых проці індыфэрэнтызму Лігі Нацый у адносінах да нацменскіх інтарэсаў. Зьезд запрапанаваў Лізе Нацый утварыць пры ёй сталую камісію для спраў нацыяналасьцяў.

Пасьля ўсяго гэтага справа нацыяналасьцяў стала на сабраньні Лігі Нацый прадметам ажыўленай дыскусіі. Дакладчыкам па ёй выступіў міністр замежных спраў Галяндыі т. Блёклянд, які выказаўся за ўтварэньне пры Лізе сталай нацменскай камісіі. Нямецкі канцлер Мюльлер падтрымаў гэтую прапазіцыю, сьцьвярджаючы, што на яе трэба «зьвярнуць усю нашу увагу», бо справа меншасьцяў зьяўляецца «важным пытаньнем» Лігі. З вялікім энтузіязмам гаварыў аб меншасьцях дэлегат Швэйцарыі п. Мотта. І ён глядзіць на прапазіцыю Галяндыі „з найвышэйшай сымпатыяй", і ён цешыцца існаваньнем у мірных трактатах „гарантыі для меншасьцяў", і ён хацеў-бы цяпер, каб гэтыя пастановы трактатаў выконваліся. З агрэмадным націскам і вельмі доўга гаварыў па гэтай справе канцлер Аўстрыі ксёндз Сэйпэль.

Магло здавацца, што справа пройдзе гладка.

Але вось бярэ голас прадстаўнік Францыі Брыян. Ён груба абрушваецца на Нямеччыну і Аўстрыю, якія цяпер стаяць за правы меншасьцяў, а раней—да вайны—самі душылі гэтыя меншасьці,—як быццам справа цяпер ідзе не аб меншасьцях, а аб тым, хто іх бароніць. Далей ён прыпомніў, што перад вайною было 100 мільёнаў меншасьцяў, а цяпер толькі 20. Тут Брыян даў сумысную абмылку—у Зах. Эўропе налічваецца цяпер 30 мільёнаў нацыяналасьцяў. Потым Брыян выказаўся проці таго, каб справа нацыяналасьцяў „падважвала ўрады і парушала супакой". Справа гэтая ня можа стаць прычынай вайны і замешак... Калі-б—далей казаў Брыян — ня ведаю які акт справядлівасьці трэба было-б выканаць праз зьнішчэньне супакою на сьвеце і праз зварот учарайшага непакою, буду крычаць: «Маўчаць!»

Зразумела, што такі чыста фашысцкі тон прамовы п. Брыяна вельмі спадабаўся прадстаўніку Італіі і, ня гледзячы на тое, што паміж Італіяй і Францыяй адносіны цяпер досыць напружаныя, прадстаўнік Мусаліні п. Сцыалойя горяча рукапляскаў Брыяну.

Зразумела, што горача падтрымалі Брыяна і прадстаўнікі такіх дзяржаў, як Чэха-Славакія і Польшча, дзе нацыяналасьці складаюць амаль ні палавіну ўсяе іх насельнасьці.

Прадстаўнік Чэха-Славакіі спрацівіўся ўтварэньню сталай камісіі па справах нацыяналасьцяў па тых прычынах, што гэтая камісія была-б месцам сталых інтрыг і ставіла-б гэту дзяржаву ў проста нязноснае палажэньне.

Прадстаўнік Польшчы міністр Залескі сказаў, што калі столькі дзяржаў занепакоена лёсам меншасьцяў, дык ці не належала-б перш усяго расшырыць іх правы на ўсе дзяржавы, а не абмяжоўвацца толькі новаўтворанымі дзяржавамі. Тады інакш можна-б было глядзець на сталую камісію па справах меншасьцяў. У справах меншасьцяў найбольш скандальнай рэчу зьяўляецца іх выключнае стасаваньне да некаторых толькі дзяржаў. Трэба мець вялікую сьмеласьць, каб са сьлязою на воку жадаць ад некаторых дзяржаў усё больш прывілеяў для меншасьцяў, усё большага абмежаваньня ўласнай бязьпечнасьці, што раз больш падкапваць іх годнасьць, а самому ня мець ніякіх абавязкаў.

Так загаварылі цяпер тыя, хто калісьці безагаворачна падпісаў трактат абправох для нацыяналасьцяў. Цяпер яны не адчуваюць сябе абавязанымі выконваць гэтыя трактаты і нават пагражаюча пытаюць, а чаму толькі яны—новаўтвораныя дзяржавы—павінны мець некаторыя абавязкі ў адносінах да нацыяналасьцяў? Чаму-ж і ўсе іншыя дзяржавы, у межах якіх пражываюць нацыяналасьці, але якія не падпісвалі ніякіх абавязваючых у адносінах да нацыяналасьцяў актаў, чаму яны не павінны выконваць тых-жа абавязкаў.

Трэба прызнаць, што па сутнасьці (а не з фармальнага боку). Залескі праў. Правы нацыяналасьцяў (павінны быць абавязваючымі для ўсіх дзяржаў, але вышла інакш таму, што пры заключэньні Вэрсальскага міру дзяржавы-пераможцы дыктавалі свае ўмовы слабейшым, а сябе толькі загарантоўвалі ў выгадах і ні ў чым ня зьвязвалі. Цяпер гэта недарэчнасьць яскрава выявілася і таму справа нацыяналасьцяў апынулася на мёртвым пункце. Грубае выступленьне Брыяна з яго напрокамі ў бок Нямеччыны і Аўстрыі і з пагрозамі прымусіць маўчаць у бок усіх нацыяналасьцяў—найлепшы доказ таго, як капіталістычна-імпэрыялістычны сьвет, аб'яднаны ў Лігу Нацый, рэагуе на справядлівыя вымаганьні прыгнечаных нацыяналасьцяў.

Такая ўжо прырода капіталізму.

І ў адносінах да нацыяналасьцяў, і ў адносінах да калёніяльных народаў, і ў адносінах да фармальна «незалежных», але слабейшых дзяржаўных арганізмаў, буйны капіталістычны дзяржавы вядуць аднолькавую палітыку прыгнечаньня і эксплёатацыі.

Ліга Нацый праваліла на гэты раз прапазіцыю ўтварэньня спэцыяльнай сталай камісіі па справах нацыяналасьцяў і, можна думаць, што і надалей, калі-б гэтае пытаньне як-небудзь ізноў узышло на парадак дню будзе яго правальваць. Капіталістычныя дзяржавы добра ведаюць, што пасьля першага кроку лёгічнага наступае другі; пасьля першай палёгкі наступае далейшая; пасьля наданьня некаторых правоў нацыяналасьцям трэба-ж надаць некаторыя правы і калёніяльным народам. А далей? Хто яго ведае, ці ня ўздумаюць прыгнечаныя ўсяго сьвету вызваліцца зусім з-пад апекі сваіх эксплёататараў? Гэтага-та і баяцца паны кіраўніві Лігі Нацый, якім ходзіць цяпер толькі аб утрыманьні свайго ўпрывілеяванага палажэньня, а там, як кажуць, хоць трава не расьці.

Ці зразумеюць урэшце гэта нацыяналасьці ўсяго сьвету і ці не захочуць тады яны прыпнаць, што толькі пралетарская рабоча-сялянская ўлада можа вырашыць без перашкод для прыгнечаных і нацыянальныя і калёніяльныя і ўсе іншыя балючыя пытаньні, якія душаць сваім цяжарам працоўных усяго сьвету, дзякуючы капіталістычна-імпэрыялістычнаму яго ў

ТРЭЦЯЯ СЭСІЯ ЦВК БССР VIII СКЛІКАНЬНЯ.

Дзяржаўны бюджэт БССР на 1928-29 год.

СПРЭЧКІ ПА ДАКЛАДУ тав. МІКУЛІЧА.

ПРАМОВА ТАВ. ШАРШНЁВА.

Пазаўчора Народны Камісар Фінансаў у сваёй справаздачы гаварыў, што нашая прамысловасьць у параўнаньні з 1913 г. вырасла ў 1928-29 г. на 200 проц. У другім месцы, дзе ён прыводзіў лічбы, выходзіць, што ў 1926-27 г. мы ўкладалі ў нашую прамысловасьць 11 міліёнаў, у 1927-28 г.—17 міліёнаў, а на 1928-29 г. мяркуецца ўлажыць 29 міліёнаў. Калі паглядзець на гэты рост з надворнага боку, то гэта бязумоўна вялікі рост. Але калі падыйсьці бліжэй, то бачым тут адкоўныя моманты, і калі мы будзем больш падрабязна аналізаваць бюджэт, то знойдзем тут некаторыя недахопы.

Я лічу, што—ня гледзячы на гэтыя вялікія лічбы, мы, гаспадарнікі, кажам—выходзячы з нашага агульнага гістарычнага становішча, з агульнага становішча нашай сялянскай гаспадаркі, гэтыя лічбы ўкладаньня ў прамысловасьць зьяўляюцца недастатковымі і яны нас ні ў якім разе ня могуць задаволіць. Мы добра ведаем, што наша Беларусь, у зьвязку з яе цяжкім мінулым, нават пры гэтым росьце ня будзе мець магчымасьці называцца прамыслова-аграрнай краінай, нават аграрна-прамысловай краінай. Яна проста будзе называцца пры такім росьце сялянскай краінай з некаторымі зачаткамі прамысловасьці.

Калі раўняць нашае становішча з іншымі рэспублікамі, то мы бачым наступнае: ня прыходзіцца ўжо раўняць Беларусь з такімі краінамі, як Данія, Нямеччына, дзе ўзровень прамысловасьці вельмі вялікі і адсюль там вельмі высокая культурнасьць сялянскай гаспадаркі.

Вось учора тут выступала жанчына і гаварыла, што з нашай дзесяціны мы зьбіраем 48 пудоў насеньня. Зусім іншыя лічбы ў «булуарах» расказваў нам Наркамзем т. Прышчэпаў на падставе таго, што ён бачыў у Даніі: там з дзесяціны зьбіраюць насеньня пачынаючы з 100 пудоў да 150 пуд. і даходзіць да 200 пуд. Я лічу, што гэты ўраджай, гэтая высокая культура цалкам залежыць ад узроўню прамысловасьці. Адсюль мы робім такі вынік, што тыя лічбы, якія мы ўкладаем у прамысловасьць, цалкам адбіваюцца і на становішчы нашай сельскай гаспадаркі. Мы ведаем, што ў нас яшчэ шмат злыдняў ёсьць у сялянскай гаспадарцы і што ўзровень нашай прамысловасьці вельмі невялікі. Мы гэтым ня можам задаволіцца і гаворым, што трэба шукаць больш рашучых шляхоў і крыніц на зьнішчэньне гэтых недахопаў.

Я ня згодзен з адным з гаспадарнікаў, які казаў тут «робка», неяк асьцярожна, што тыя лічбы, якія нам адпускаюцца на прамысловасьць, трэба запісаць, што яны зьяўляюцца невялікімі. Я падумаў, што гэты таварыш мусіць спалохаўся таго, што ў нас маецца дэфіцыту 9000000 р., і калі нам не пакрыюць усяго дэфіцыту, то будуць — «рэзаць» па прамысловасьці. Я лічу, што становішча прамысловасьці ў нас такое, што ў нікога з таварышоў ня можа быць і думкі аб тым, каб пайсьці па лініі скарачэньня тых лічбаў асигнаваньняў, якія намечаны для нашай прамысловасьці. Нам трэба на сэсіі падкрэсьліць, што трэба шукаць самых рашучых мерапрыёмстваў для павялічэньня сродкаў у нашу прамысловасьць, бо гэта дасьць павялічэньне ўкладаньняў і ў сельскую гаспадарку.

Таварыш Фіш ужо прыводзіў тут яскравы прыклад аб тым, які процант з тых сродкаў, што адпушчаюцца на Мэталётрэст, фактычна ўходзіць у сялянскую гаспадарку. Я, як працаўнік Асінбуду, таксама магу падкрэсьліць, што значныя сумы з таго, што выдаткоўваюцца на Асінбуд, бязумоўна пойдуць у нашу сялянскую гаспадарку.

Правільна, што ў нас дэфіцыт у 9 міліёнаў, што мы просім яшчэ 6300000 руб. на ф-ку штучнага валакна, а на наступны год 4200000 р. і праўда, што маем думку яшчэ атрымаць ад Саюзу сродкі па цэламу шэрагу іншых нашых галін прамысловасьці. І тут узьнікае пытаньне: а як-жа будзе, калі нам усяго гэтага цалкам не дадуць. Ці-ж невядома, што цалкам нас не задаволяць, што наўрад ці мы атрымаем усё тое, што мы просім на нашыя патрэбы.

Я лічу, таварышы, што цалкам спадзявацца не тое, што мы ўсё зможам атрымаць, не патрэбна; мы павінны прадугледзець і свае ўласныя шляхі. Вось, напрыклад, першы шлях—пытаньне адносна эканоміі, адносна мэтазгоднага скарыстаньня сродкаў і г. д.; мы добра ведаем, што раней сэсія давала дырэктывы ў гэтым напрамку. І вось у нас, бязумоўна, тут маюцца некаторыя недарэчнасьці ў гэтай галіне. Мабыць не асабліва вялікія, але ўсё-такі можна лёгка на некаторыя з іх указаць.

Напрыклад, калі паглядзець на старонку 20-ю нашага кантарысу, дык убачым, што тут дырэктыва аб паменшаньні выдаткаў на апарат толькі па ЦВК выканана, па якому можна знайсьці некалькі скарочаных адзінак, а калі па другіх установах паглядзець, то апарат іх стабілізован. І вось наш дакладчык і садакладчык як-та бачком праходзілі міма гэтага пытаньня. Мабыць тут ёсьць такія ўстановы, як Наркамгандаль, дзе жыцьцё высунула іншыя патрэбы і дзе патрэбна было павялічыць штат. Па РСІ—таксама зараз у парадку самакрытыкі столькі працы, што трэба павялічваць штат, але калі паглядзець на іншыя сапраўды адміністрацыйныя наркаматы, то і там таксама маецца павялічэньне штатаў.

А вось, калі да нас прыяжджае РСІ, то ў чацьвярых сядзелі 12 дзён і так усё прашчупалі, што запрапанавалі скараціць столькі та адзінак і ўказалі лічбу з тым, каб на працягу гэтага году гэтая дырэктыва была выканана.

І апошняя дырэктыва—далейшае выяўленьне прыбытковых крыніц. Возьмем прыбытковыя крыніцы, напрыклад, прыватны гандаль: мы добра ведаем, што ён пачынае кульгаць па маленьку, але калі паглядзець на іншыя галіны, то і яны таксама вялікага эфэкту ня могуць даць, а могуць толькі да некаторай ступені збалансаваць нашыя выдаткі, а вывяць асьльш прыбытковых крыніц, бязумоўна, цяжка. Праўда, масца некаторае павялічэньне падатку ў галіне нашай лясной гаспадаркі, але гэта недастаткова і нам трэба больш рашуча ў гэтай галіне падумаць.

ПРАМОВА ТАВ. ЯКАБСОНА.

— Я хочу сказаць некалькі слоў адносна таго месца, якое займаюць у бюджэце выдаткі на капітальнае будаўніцтва па прамысловасьці. Здавалася-б, што 11 з лішнім міліёнаў, прадугледжаныя па бюджэту, зьяўляюцца досыць значнай сумай у адносіне да 77 млн., прадугледжаных па бюджэту.

Але тут належала-б зьвярнуць увагу на капітальнае пераабсталяваньне нашых прадпрыёмстваў, якое нам бязумоўна зараз вельмі неабходна. Трэба лічыцца з тэю спадчынаю, якая нам пакінута: наша беларуская прамысловасьць зьяўляецца прамысловасьцю не заўсёды канкурэнтаздольнай з прамысловасьцю цэнтральных райёнаў Саюзу.

Я хочу падаць хоць-бы адзін канкрэтны прыклад з папяровай прамысловасьці, прадстаўніком якой я зьяўляюся. Мы зараз робім пераабсталяваньне аднэй з нашых буйных папяровых фабрык—«Добруш», выдаткі на якую прадугледжаны каля 6 млн. руб. і ўстаноўка аднэй тэхнічна ўдасканаленай машыны па вырабу паперы павінна даць вытворчасьць на 100 пр., існуючых на гэтай-жа фабрыцы 5 машын. Гэта досыць ясна сьведчыць аб тым, наколькі мы тэхнічна адсталі, наколькі нашы прадпрыёмствы ў большасьці выпадкаў зьяўляюцца неканкурэнтаздольнымі.

Я хочу падаць яшчэ адзін прыклад: з 8 прадпрыёмстваў якія аб'яднаны Буматрэстам, толькі 3 найбольш буйныя фабрыкі зьяўляюцца канкурэнтаздольнымі і маюць перспэктывы ў будучыні, а рэшта фабрык патрабуюць ці грунтоўнага пераабсталяваньня, ці пабудовы новых прадпрыёмстваў.

Адгэтуль можна зрабіць вывад, што асигнаваньні на прамысловасьць павінны быць значна большыя.

Яшчэ адзін момант адносна сум на барацьбу з беспрацоўем. Зусім зразумела, што гэта сума ў 1 млн. 300 тыс. руб. таксама пры сучасным беспрацоўі недастаткова. Гэты момант належыць увязаць з капітальным будаўніцтвам, з павялічэньнем рабочай сілы, якое будзе мець месца пры скарачэньні нашых прадпрыёмстваў і рэканструкцыі нашага асноўнага капіталу.

Водлуг маёй думкі, асноўны момант, які слаба адбіты ў бюджэце, гэта аб падрыхтоўцы тэхнічных кадраў, кіруючых капітальным будаўніцтвам, якое мы праводзім. Мы маем у бюджэце асигнаваньні на падрыхтоўку працаўнікоў асьветы, медыцынскіх і г. д.

Але мы маем вельмі часта ў буйнейшых капітальных будаўніцтвах на міліённыя сумы такое становішча, што гэтым будаўніцтвам кіруюць недастаткова падрыхтаваныя тэхнікі, а ў некаторых выпадках—практыкі. Калі мы мала адзначаем нашы недахопы, а гэтыя недахопы бязумоўна маюць месца ў кожнай галіне прамысловасьці, дык гэта зьяўляецца галоўным нашым злом.

Я лічу, што па бюджэту Наркамасьветы або ў выдатках па лініі прамысловасьці павінны быць прадугледжаны спэцыяльна гэткія сумы для падрыхтоўкі тэхнічных кадраў. Мы зьбіраемся па нашай пяцігодцы траціць вялізарныя сумы, здасцца звыш 70 млн. руб., а ня маем адпаведных кадраў для правядзеньня гэтага капітальнага будаўніцтва.

ЗАКЛЮЧНАЕ СЛОВА тав. МІКУЛІЧА.

Пасьля прамовы старшыні СНК тав. Галадзеда, які ў асноўным даў адказ амаль на ўсе галоўныя запатрабаваньні па бюджэту з боку членаў ЦВК, я спынюся толькі на некаторых пытаньнях, якія былі высунуты членамі ЦВК.

Таварышы завострывалі ўвагу на сельскай гаспадарцы, галоўным чынам на якасьці яе—на павышэньні ўраджаю і г. д. Правільна таварышы спыняліся на адным з галоўнейшых мерапрыёмстваў, якое будзе дапамагаць палепшаньню якасьці сельскай гаспадаркі—гэта паземляўпарадкаваньні. Бюджэтам прадугледжваюцца цалкам выдаткі на той плян па земляўпарадкаваньню, які можа быць выкапан НКЗемам. Далейшае пашырэньне пляну ўпірасца ўжо ня ў грошы, а ў недахоп тэхнічнай сілы—каморнікаў і інш. Бюджэт таксама прадугледжвае аслабаненьне 35 проц. бяднейшага сялянства ад платы за земляўпарадкаваньне і правядзеньне гэтага земляўпарадкаваньня за кошт дзяржавы. Бюджэт таксама прадугледжвае галоўнейшыя мерапрыёмствы ў галіне сельскай гаспадаркі, як мэліярацыя і інш на чым тав. Галадзед спыняўся, і тут прадугледжваецца цалкам тое, што мы на будучы год па сваіх сілах зможам выканаць.

Я лічу вельмі цікавым і добрым, што прадстаўнікі з месц у адзін голас гаварылі наконт таго, што не хапае штучнага ўгнаеньня. Некалькі год таму назад селяніну трэба было яшчэ даводзіць, растлумачваць карысьць штучнага ўгнаеньня для сельскай гаспадаркі. Цяпер селянін ужо бачыць сам гэтую карысьць і ставіць перад намі задачу, каб больш забясьпечыць яго штучным угнаеньнем. Правільна таварышы падкрэсьлівалі, што заводы па выпрацоўцы штучнага ўгнаеньня (кастамольны і фасфарытны), якія прадугледжваюцца бюджэтам, трэба, у зьвязку з гэтай павялічыўшайся патрэбай абавязкова будаваць, і на ват і ў тым выпадку, калі нам не пакрыюць цалкам таго дэфіцыту, які выяўляецца па нашаму бюджэту, дык гэтыя мерапрыёмствы павінны быць цалкам зябясьпечаны, і мы павінны абавязкова пабудаваць гэтыя заводы з тым, каб мы змаглі забясьпечыць запатрабаваньні насельніцтва ў штучным угнаеньні.

Наконт малочнай кааперацыі. У гэтым годзе былі ўтвораны 4 акруговыя саюзы малочнай кааперацыі. На іх прадугледжваецца па бюджэту 150.000 руб. Апроч гэтага па крэдытнаму пляну с. г. Банку на іх прадугледжваецца крэдыт. Усё гэта дае дастатковую суму, каб разгарнуць працу кааперацыі.

Таксама цалкам забясьпечваецца па лясной гаспадарцы плян лесаўпарадкаваньня. Гэта асноўнае мерапрыёмства, якое будзе скончана ў 28-29 годзе.

Заадно я ўжо адкажу на прамову аднаго таварыша, які сказаў, што трэба паленшыць становішча лясной варты, бо лясьнік атрымоўвае 20 рублёў, і гэта недастаткова. Але трэба параўнаць думку гэтага таварыша з думкамі тых, якія гаварылі, што старшыня сельсавету атрымоўвае 28 руб. і гэтага недастаткова. Зразумела нельга раўнаць адказнасьць працы старшыні сельсавету з працаю лясьніка, бо праца старшыні сельсавету значна больш адказная. У той жа час мясцовы бюджэт ня мае магчымасьці павысіць пэнсію старшыні сельсавету. Ці можам мы пры такіх умовах павялічыць па дзярж. бюджэту пэнсію лясьніку, які яшчэ ў дадатак атрымоўвае і надзел, і боты, і плашч і апроч таго летам таксама больш працуе на сваёй гаспадарцы і г. д.

Адзін таварыш зазначыў, што мала сродкаў даецца на калектыўную гаспадарку. Калі падлічыць усе выдаткі, якія мы даём на калектыўныя гаспадаркі, то выходзіць, што на адну такую гаспадарку выходзіць каля 4000 р. у год. Гэта досыць значная сума, калі ўспомніць, што нанова створаныя калектыўныя гаспадаркі не зьяўляюцца асабліва вялікімі, аб'яднаюць прыблізна каля 10 сямей. 4000 р. на такую гаспадарку—гэта зусім даволі, каб паставіць яе моцна на ногі і даць ёй магчымасьць у далейшым разгортвацца.

Была тут таксама заўвага адносна таго, што дзяржаўны бюджэт нічога не прызначае на вайсковыя выдаткі. У першую чаргу павінен сказаць, і гэтыя таварышы самі ведаюць, што гэтыя выдаткі праходзяць па мясцоваму бюджэту па задаваленьне такіх мерапрыёмств, як дапрызыўная падрыхтоўка і г. д. Наогул-жа ўсе выдаткі на ўтрыманьне Чырвонай арміі, як выдаткі агульна-саюзнага значэньня, праходзяць па агульна-саюзнаму бюджэту.

Тав. Галадзед адзначыў ужо, як стаіць справа з пабудоваю дому ўраду. Я дам толькі адну даведку. За ўвесь час сваёй працы Менскі гарсавет толькі гэтай восеньню скончыў адзін будынак пад новую сямігодку. У Менску раней ніколі ня было столькі цэнтральных урадавых устаноў. Усе гэтыя ўстановы разьмясьціліся па лепшых памяшканьнях, і гэта вельмі адбіваецца на працы гарадзкога савету. Гэта прымушае разгортваць апроч агульнага кватэрнага будаўніцтва таксама будаўніцтва для ўстаноў. Але гарадзкі савет, аддаўшы ўсе лепшыя будынкі для дзяржаўных устаноў, ня можа справіцца з гэтай задачай. Таму стаіць пытаньне, што лепш—ці даваць сродкі гарсавету, каб дапамагаць яму будаваць будынкі для сябе, для патрэб пад школы, больніцы і г. д., альбо аслабаніць для гэтага ўсе гэтыя будынкі, якія цяпер займаюць урадавыя ўстановы, пабудаваўшы дом ураду. Савет Народных Камісараў, абмеркаваўшы гэтае пытаньне, рашыў пачаць будаваць дом ураду, які абыйдзецца таньней, пры чым утрыманьне нашых устаноў, у зьвязку з гэтым, таксама можна будзе патаніць, і ў той жа час гэта дасьць магчымасьць Менскаму гарсавету скарыстаць тыя будынкі, якія цяпер займаюцца ўрадавымі ўстановамі.

Тав. Сьцяпанаў далей гаварыў, што ўсюды па сельскай гаспадарцы мы маем рост, толькі па жывёлагадоўлі—мінус. Але калі вы глядзіце на старонцы 85 бюджэту, то вы ўгледзіце, што і тут мы таксама маем рост.

Некаторыя таварышы рабілі заўвагі наконт таго, што вельмі цяжка атрымаць крэдыт па мясцох, што шмат прыходзіцца за ім хадзіць і г. д. Зразумела, гэта трэба зьнішчыць. Аб такіх выпадках цеганіны трэба і ў газэтах пісаць і зьвяртацца ў СНК.

Савнарком цікавіўся ўвесь час як веснавым, так і асеньнім пасевам, каб грошы былі перададзены своечасова. Трэба на мясцох гэтую працу правяраць, каб ніякіх затрымак ня было.

Тут таварыш Масальскі ў сваёй прамове высунуў такую думку, што сыстэма абкладаньня сельгаспадаркам утварае небясьпеку павялічэньня колькасьці бяднацкіх гаспадарак. У той частцы, дзе ён гаварыў, што ў нас ёсьць цэлы шэраг памылак і недахопаў на мясцох, я з ім згодзен, што, скажам, пераблыталі індывідуальнае абкладаньне з абкладаньнем бяднацкіх гаспадарак. Калі гаспадарка карыстаецца чужой працай, дае грошы і бярэ за гэта вялікі процант і калі гэтая гаспадарка за кошт гэтых непрацоўных прыбыткаў значна ўзмацняецца, то яе можна абкласьці ў індывідуальным парадку на ўсе 100 проц. Але на мясцох ёсьць такія выпадкі, што пераблыталі, зрабілі індывідуальнае абкладаньне і тыя гаспадаркі, якія карысталіся часовай нешмнай працай, як пастушком, жнаёй і г. д., або, напрыклад, быў такі выпадак, што зарабіў два рублі на малатарнях, папрацаваў у свайго суседа і яго залічылі, што ён падлягае абкладаньню ў індывідуальным парадку.

Такія памылкі ёсьць, зараз гэтая праца ўсюды правяраецца і трэба ўважліва пры разглядзе скарг, якія ёсьць, разглядаць гэтыя справы. Да мяне, напрыклад, за час сэсіі прыходзілі і гаварылі, што ня верна запісалі бычка або іншую жывёлу, што яму ня тры гады, а два з паловай, а яго запісалі. Гэта ўсё важна.

Як у нас пабудавана сыстэма сельгаспадатку? Камісія на мясцох з прадстаўнікамі сельсавету з удзелам саміх плацельшчыкаў падатку, з абранымі людзьмі на сходах займаюцца гэтаю справай, пры чым вынікі вучоту павінны агалашацца на сходах і там абгаварвацца дзе што зроблена на правільна. Але, можа быць, ёсьць такія выпадкі, калі які-небудзь сябра камісіі, жадаючы зьвесьці рахункі з суседам, прыпісвае яму лішняе. З гэтым трэба змагацца, выпраўляць і прыцягваць да адказнасьці тых працаўнікоў на мясцох, якія няправільна прыпісваюць лішняе з прыбыткаў таго ці іншага гаспадара.

Але я ня згодзен, зразумела, з думкаю тав. Масальскага, што гэтая сыстэма дае магчымасьць памножыцца бяднацкім гаспадаркам.

Можа я не зразумеў тав. Масальскага, я ня ведаю, але калі так сказаць, то трэба тады правесьці цэлы шэраг мерапрыёмстваў.

Ці спрыяе наша палітыка для разгортваньня сельскай гаспадаркі? Я ўжо ў сваім дакладзе гаварыў лічбамі аб узросьце сельскай гаспадаркі, зазначыў, што падатковая палітыка не разбурае сельскую гаспадарку. Ці трэба аслабяць 35 пр. беднякоў у сельскай гаспадарцы? Я ня думаю, каб т. Масальскі сур'ёзна ставіў пытаньне, што ня трэба іх аслабяць, што ўсякі захоча, каб не плаціць падатку, быць бедняком. Такой думкі ў сялян няма. Можа быць гэта асабістая думка т. Масалькага, а клясавы прынцып у падатковай палітыцы ў сельскай гаспадарцы праводзіцца і гэта добра адбіваецца, што бярэцца па даходах. Чым гаспадар мацней, налог з яго бярэцца больш. Аслабяняецца бядняк і серадняк, які плаціць меншы процант ад свайго ўмоўнага чыстага прыбытку, чым заможная частка.

Зараз наконт мясцовага бюджэту. Цэлы шэраг таварышоў выказваліся, што мясцовы бюджэт ня можа справіцца з падвышэньнем заработнай платы, з будаўніцтвам школ, дарог і г. м. Праўда, мясцовы бюджэт адрозьніваецца ад дзяржаўнага тым, што ён зьяўляецца ў асноўным сацыяльна-культурным бюджэтам. Гэта сацыяльна-культурныя выдаткі на школы, прычым па мясцоваму бюджэту на народную асьвету ідзе 17 з паловай міліёнаў рублёў. На будучы год у тых дырэктывах, якія Савнарком дае, каля 500 новых школ на сяле будзе адчынена з пачатку навучальнага году.

Але мясцовы бюджэт яшчэ ня можа цалкам задаволіць усіх запатрабаваньняў і яго трэба ўзмацніць. Тут ёсьць два шляхі для ўзмацаваньня: першы за кошт прад'яўленьня ўсё большых запатрабаваньняў да дзяржаўнага бюджэту, бо тут прыбыткі больш узрастаюць, а разам і адлічэньні ад дзяржаўных прыбыткаў, свае-ж даходы мясцовыя растуць зусім марудным тэмпам.

Савнаркомам узьнят цэлы шэраг пытаньняў перад Саюзам аб тым, каб у суадносінах дзяржаўнага бюджэту з мясцовым унесьці некаторыя зьмены ў бок павялічэньня прыбытковых крыніц для мясцовага бюджэту і аслабаненьня яго некаторых выдаткаў, якія па думцы Савнаркому трэба аднесьці на дзяржаўны бюджэт. Гэта адзін шлях.

Разам з гэтым Савнарком даў дырэктыву ўсім АВК больш зьвярнуць увагу на падвышэньне прыбытковых крыніц у мясцовым бюджэце.

Калі мы паглядзім на мясцовую гаспадарку, мы ўбачым там цэлы шэраг недарэчнасьцяй, ня вельмі добрае гаспадараньне як у РВК, так і ў АВК і замест прыбыткаў мы маем убыткі, а бюджэт павінен гэтыя ўбыткі пакрываць па тых галінах працы, дзе гэтыя ўбыткі не павінны мець месца. Ёсьць там цэлы шэраг такіх няўвязак, дзе ня цалкам выяўлены ўбыткі, напрыклад, у лясной акрузе тая ці іншая палянка ня так добра скарыстоўваецца, каб прыбытак ад яе пашоў у бюджэт. Там яшчэ праца ня так добра праводзіцца. Трэба, каб за кошт лепшага вядзеньня мясцовай гаспадаркі прыбытак больш узрос і даваў бы магчымасьць больш задаволіць запатрэбаваньні па мясцовому бюджэту. Побач з гэтым і дзяржаўны бюджэт таксама дапаможа справіцца з тымі галоўнейшымі задачамі, з якімі мясцовы бюджэт цалкам сам ня можа справіцца.

Члены Сэсіі—на будаўніцтве Унівэрсытэцкага Гарадка.

19 верасьня адбылася экскурсія членаў ЦВК, на чале з тав. Баліцкім, на будаўніцтва Унівэрсытэцкага Гарадка.

Будуецца пяць вялізарных гмахаў па апошняму слову тэхнікі. Тры карпусы (медычны, анатамічны і прыродазнаўчы) пабудаваны ўжо да 3-га паверху, два астатнія карпусы—хімічны і галоўны аўдыторны—пачынаюць будаваць першы паверх; сьпешным тэмпам вядзецца цэглянная кладка. Пабудова робіць моцнае ўражаньне: адчуваецца манументальнасьць, тэхніка; шмат жалеза, бэтону; нешта магутнае вырастае; будуецца сапраўдны помнік культуры.

Інжынэры Алхазаў, Яноўскі, вытвараючы работы Сарокін растлумачваюць членам ЦВК складаныя тэхнічныя канструкцыі. У некаторых месцох надзвычайна складаныя косонныя перакрыцьці зьяўляюцца першымі па сваёй велічыні ў Саюзе. У сутарэньні прыродазнаўчага корпусу будуецца цэнтральная кацельная, якая будзе з аднаго месца аграваць і вэнтыляваць усе карпусы Унівэрсытэцкага Гарадка. Аграваньне і вэнтыляцыя таксама надзвычайна складаныя і рэдкія ў Савецкім Саюзе. Такое аграваньне і вэнтыляцыя зьяўляюцца надзвычайна выгаднымі ў сэнсе эканоміі апалу, чыстаты і гігіены. Працуюць падёмныя машыны, якія падаюць паверх цэглу і жалезабэтон; вялізарныя машыны, прывезеныя з Нямеччыны, дзесяткамі кубоў выкідаюць бэтон кожны дзень.

На ўсіх работах Унівэрсытэцкага Гарадка занята каля 500 чал. рабочых. Члены ЦВК вялі гутарку з паасобнымі рабочымі. Рабочыя захоплены будаўніцтвам, працуюць з энтузіязмам; адчуваюць, што кожная цэгла, кожны кавалак жалезабэтону, які яны закладаюць, узмацняюць савецкую ўладу і дыктатуру пралетарыяту.

Арганізуецца лятучы мітынг. **Выступаюць рабочыя з прывітаньнем Сэсіі ЦВК.** Лапатная, сярмяжная. Беларусь без дапамогі капіталістаў сваімі ўласнымі мазолістымі рукамі адбудоўвае сваю гаспадарку і культуру.

Інжынэр Яноўскі ад тэхнічнага пэрсаналу заяўляе, што інжынэры і тэхнікі, якія працуюць на пабудове Унівэрсытэцкага Гарадка, адчуваюць усю вялізарную адказнасьць, якую яны пасуць, і пыльна сачаць за кожнай пакладзенай цэглінай за кожным камеьнем, за кожным кавалкам жалезабэтону.

З адказам на прывітаньне рабочых і тэхнічнага пэрсаналу ад імя экскурсантаў выступае Нарком Асьветы **А. В. Баліцкі**, які адзначае, што пабудова Асінстрою і Унівэрсытэцкага Гарадка, двох вялізарных мерапрыёмстваў у галіне сацыяльнага будаўніцтва, зьяўляецца паказальнікам таго, як аб'яднаецца пры Савецкай Уладзе гаспадарчае і культурнае будаўніцтва. Унівэрсытэт будуецца для рабочых і працоўнага сялянства. Пралетарыят, які ўзяў у маду ў свае рукі, каб замацаваць сваю дыктатуру, павінен аўладаць усімі камандными вышынямі будаўніцтва. Рабочы павінен сядзець у Акадэміі Навук і распрацоўваць навуковыя праблемы; павінен быць вучоным, інжынэрам, тэхнікам, агрономам, пэдагогам, доктарам, кіраўніком савецкай установы; а для гэтага пралетарыят і працоўнае сялянства павінны цалкам запоўніць усе навучальныя ўстановы. Унівэрсытэт, які мы будуем, у сваіх сьценах будзе выхоўваць рабочых і сялян—будаўнікоў сацыялістычнай дзяржавы.

Дзеньнік Сэсіі.

21 верасьня на РАНІШНІМ пасяджэньні адбыўся даклад аб Крымінальным Кодэксе БССР—дакладчыкі т. т. Сташэўскі і Гохман—і вяліся спрэчкі па гэтым пытаньні.

На ВЯЧЭРНІМ пасяджэньні—працяг спрэчак па дакладах т. т. Сташэўскага і Гохмана.

А. Луначарскі.

ЛЕНІН ПРА ТАЛСТОГА.

У сувязі з юбілеем Талстога моцна разгортваюцца спрэчкі аб ім.

Гэта вельмі добра. Леў Талстой зьяўляецца такой буйнай фігурай, што разабрацца ў ім, як мага больш падрабязна, адсеяць у ім пшаніцу і сьмецьце і ня проста пусьціць пшаніцу для ўжываньня, а сьмецьце—на спаленьне, а прааналізаваць і тое і другое,—будзе для нас вельмі карысна.

Пяць невялікіх артыкулаў Леніна, прысьвечаных Талстому, зразумела, ня могуць выканаць гэту задачу. Ня выканана яна, зразумела, ні вельмі вялікай бібліятэкай, выпушчанай талстоўцамі ці буржуазеяй, ні тымі нематлікімі творамі, якія да гэтага часу напісаны ў гэтым напрамку марксыстамі. Мы спадзяёмся, што яраз юбілей народзіць новую марксысцкую, ленінскую літаратуру аб Талстым, якая пазаўсёды ўстановіць яго сапраўдную ацэнку і, паралізаваўшы яго шкодны рэакцыйны ўплыў, надасьць затое тым большую эфэктнасьць вялізарным станоўчым сілам, якія захаваны ў яго мастацкай творчасьці.

Але калі брашура, складзеная з пяці артыкулаў Леніна, ня можа лічыцца вычэрпваючай, дык яе мы ўсё-ж павінны лічыць накіроўваючай, і ня толькі таму, што мы наогул прызнаем верыць аўтарытэту Леніна, але і таму, што брашура гэта сапраўды геніяльная. Падыход Леніна да Талстога надзвычайна выразны. Ленін мог адзначыць толькі самае галоўнае ў супярэчнасьцях, з якіх складаецца талстоўства, але гэта галоўнае абмалёвана з надзвычайнай трапнасьцю, і гэтаму галоўнаму знойдзена сацыяльная прычына.

Ужо ў першым артыкуле Леніна, надрукаваным у верасьні 1908 г., пад загалоўкам «Леў Талстой, як люстра расейскай рэвалюцыі», Ленін не адзін раз называе Талстога «вялікім мастаком», але адзначае вельмі выпуклыя супярэчнасьці «талстоўчыны». Ён пералічвае станоўчыя рысы Талстога, і таварышом, якія ў апошні час надмерна раскрычаліся аб шкодзе талстоўства, нічым не адзначылі яго сьветлыя бакі, належала-б уважліва перачытаць гэты пералік. Для Леніна Талстой—«геніяльны мастак, які даў ня толькі цудоўныя малюнкі расейскага жыцьця, але і першаклясныя творы сусьветнай літаратуры»; для яго ён «надзвычайна сільны, просты і шчыры пратэстант супроць грамадзкай маны і фальшу», для яго ён «бязьлітасны крытык капіталістычнай эксплёатацыі, выяўнік урадавых гвалтаў, камедыі суду і дзяржаўнага кіраўніцтва, чалавек, які выкрыў усю глыбіню супярэчнасьцяй паміж ростам багацьцяў, заваёваю цывілізацыі і ростам убоства, адзічаласьці і пакут рабочых мас»; для яго ён —„цьвярозы рэаліст, які сарваў усе і ўсялякія маскі“.

Падумаць толькі,—няўжо пісьменьніка, уладаючага такою вартасьцю, можна замаўчаць, скрыць ад мас, ня гледзячы на існаваньне побач з станоўчымі бакамі адмоўных і шкодных бакоў.

Але гэтыя адмоўныя і шкодныя бакі Ленін бачыць вельмі добра. З другога боку, Талстой для яго абшарнік, «юродствующий во христе». «Юродивой» лічыць ён пропаведзь непраціўленьня злу, гвалту. Яго абурае ў Талстога «пропаведзь аднэй з найбольш агідных рэчаў, якія толькі ёсьць на сьвеце, іменна рэлігіі—імкненьне паставіць на месца папоў на дзяржаўныя пасады—папоў па маральнаму перакананьню, г. зн. культываваньне самай вострай і таму асабліва агіднай папоўшчыны».

Ці можна не згадзіцца з тым, што многае і станоўчае і, асабліва, адмоўнае ў Талстога вырасла з яго панства? Не, гэтага адмаўляць немагчыма. Пры больш дакладным і шырокім аналізе нам прыдзецца доўга на гэтым спыніцца. Але характэрна і цудоўна ў аналізе Леніна тое, што ён зусім не закранае яго панства, і аб ім успамінае, як аб рэчы другарадная значэньня.

Пытаючыся сябе, чаму Талстой аказаўся такім вялікім пісьменьнікам, ён прыходзіць да выводу, што «Талстой вялікі, як выказальнік тых ідэй і тых настроў, якія стварыліся ў міліёнаў расейскага сялянства (курсыў мой. А. Л.) у часе наступу буржуазнай рэвалюцыі ў Расеі». Адгэтуль ён робіць шэраг бліскучых вывадаў, на якіх мы спыняцца тут ня будзем, бо кожны пісьменны чалавек павінен прачытаць самога Леніна.

У другім артыкуле асабліва важна адзначыць палажэньне Леніна аб тым, што «эпоха падрыхтоўкі рэвалюцыі ў аднэй з краін, прыгнечаных рабаўласьнікамі, выступіла дзякуючы гэніяльнаму асьвятленьню Талстога, як крок наперад у мастацкім разьвіцьці ўсяго чалавецтва». Талстоўская мастацкая творчасьць агалашаецца тут Леніным крокам наперад у мастацкім разьвіцьці ўсяго чалавецтва. Няхай памятаюць гэта тыя, хто хоча зьнішчыць значэньне Талстога. Але яшчэ важней уявіць сабе, што самая вялікасьць Талстога зьяўляецца, такім чынам, адбіткам тых, галоўным чынам, сялянскіх рухаў, якія папераджалі Кастрычнік. І Ленін разумее, што вялізарная пралетарская рэвалюцыя павінна, калі яна знойдзе аднаведнага чалавека, даць зрухі яшчэ непараўнаўча больш манументальныя ў мастацкім жыцьці чалавецтва.

У трэціх артыкуле—«Талстой і яго эпоха», напісаным у такі час, калі Талстога стараліся скарыстаць як контр-рэвалюцыйную сілу, Ленін асабліва востра нападае на адмоўныя бакі талстоўства. Тут выказвае ён тыя думкі, на якія стараюцца зараз спасылацца людзі, што лічаць неабходным накінуць нейкую заслону Талстога, прадставіць яго шкодным нашай сучаснай, савецкай сапраўднасьці. Ленін гаворыць тут: „Чвэрць веку таму назад крытычныя элементы вучэньня Талстога маглі на практыцы прыносіць часамі карысьць некаторым пластом насьельніцтва, наперакор рэакцыйным і ўтапічным рысам талстоўства. У нашы дні, пасьля таго, як шэраг зазначаных вышэй падзей паклаў канец „усходняй“ нярухавасьці, у нашыя дні, калі такое вялікае распаўсюджваньне атрымалі, у карысна-клясавым сэнсе рэакцыйныя ідэі «вехаўцаў» сярод ліберальнай буржуазеі, калі гэтыя ідэі заразілі нават частку бадай-што марксыстаў, стварыўшы „ліквідатарскую“ плынь, у нашыя дні ўсякая проба ідэалізацыі вучэньня Талстога, апраўданьня або зьмякчэньня яго «непраціўленства», яго апэляцыі да „Духу“, яго заклікаў да „маральнага самаўдасканаленьня“, яго дактрыны „сумленьня“, усеагульнай „любові“, яго пропаведзі аскетызму і г. д.,—прыносьць самую непасрэдную і самую глыбокую шкоду“.

Разьбіраемся ў гэтай надзвычайнай думцы Леніна. Перш усяго ён падкрэсьлівае асаблівую шкоднасьць талстоўства „ў нашыя дні“, якія ён характарызуе, як дні рэакцыі „вехаўцаў“ і „ліквідатарства“. Заўважым сабе, перш усяго гэта. Але, зразумела, ва ўсякія дні ідэалізацыі Талстога, апраўданьне яго адмоўнага, з нашага пункту гледжаньня, вучэньня было-б шкодным, і кожны, хто спрабаваў-бы ў сучасны момант, лічачы сябе ленінцам, пайсьці па гэтаму шляху, заслугоўваў-бы асужденьня і суровага папярэджаньня.

Аднак, нашыя дні зусім не падобны да дзён рэакцыі 1911 г. Калі ўсякая ідэалізацыя Талстога і зараз шкодна, дык зусім абэктыўны разбор твораў Талстога і распаўсюджваньне яго твораў, абгаварваньне іх, з адзначэньнем тых бліскучых бакоў, якія ім уласьцівы, больш чым магчымы ў сучасны момант.

І праўда, пашукаем, ці не напісаў дзе-нібудзь Ленін пра тое, як трэба ад

...ячейка КП(б)Б і камсамольская ячейка, віхто не паклапаціўся аб тым каб правесьці сходы і расячэйкі спяць і ня думаюць ні ...

Трэба прасунуцца і ўзяцца за працу.

Л. Б.

Вінаватых трэба пакараць.

У Ірупскім райёне асеньні сеў у поўным разгары. Сяляне засяваюць свае палі неачышчаным засьмечаным насеньнем. Райвыканком і іншыя райённыя земельныя органы аб ачыстцы насеньня не паклапаціліся. Таксама дрэнна вышла з угнаеньнем. Крыху ўгнаеньня завезена, але сяляне ня ведаюць як яго ўжываць, і яно ляжыць, а агранамічны аб растлумачэньні свае часова не падумаў. План насеўкампаніі зрываецца. Сяляне патрабуюць пакараньня вінаватых у гэтым.

І.

Аршаншчына.

Асеньняя сяўба—поўным тэмпам.

Падрыхтоўчая праца да асеньняй сяўбы была праведзена добра, былі скліканы конфэрэнцыі, на якіх усебакова абгаворваўся план.

Быў зроблен рамонт збожжаачыстных машын, якіх па райёну маецца: трыераў 6, сартыровак 9.

Машыны пачалі працаваць з 21 жніўня і па 15 верасьня на іх ужо ачышчана 69 тон насеньня. Насельніцтва зрашумела карысьць ад гэтага і стараецца, асабліва беднота, каб засеяць сартаваным насеньнем. Апрача гэтага вядзецца пратручваньне насеньня азімай пшаніцы ад галаўні: пратручана 5 тон, сродкі адпушчаюцца за кошт дзяржавы.

Машын у крэдытных т-вах хапае, беднаце машыны даюцца ў доўгатэрміновы крэдыт, толькі ёсьць нелады з вешкамі, іх ужо два месяцы таму назад заказалі Віцебскім с.-г. майстэрням і да гэтага часу аб іх ні слуху ні духу.

Горш астаіць справа з штучным угнаеньнем. У райён ужо завезена і раздана насельніцтву ў крэдыт 42 тоны суперфасфату, 19 тон тамасшлаку, але гэтай колькасьці далёка не хапае, каб здавольніць той вялікі попыт, які адчуваецца сярод насельніцтва.

Для палепшаньня насеньня азімых, у райён завезена 8,5 тон сартавога жыта і раздана насельніцтву ў крэдыт.

Апрача гэтага савгасам Бярэзіна абменена (кіло за кіло) 9 тон насеньня.

Крэдытаў атрымана на штучнае ўгнаеньне 1200 рублёў,—разданы ўсе; на кантрактацыю 4240 руб., раздана 3168 руб.; на машыны 4100 руб., раздана 2600 руб.; на насеньне 1100 р., раздана 1000 руб.

На пляну намечана закантрактаваць 530 гэктараў, да гэтага часу закантрактавана 396 гэктараў (у калгасах 80 гэкт., у пасёлках і калектыўна ў вёсках 200 гэкт. і адзінкамі 116 гэктар). Кантрактуюць выключна сераднякі і беднякі.

Насельніцтва ахвотна заключае ўмовы на кантрактацыю, калі яму ў крэдыт выдаецца штучнае ўгнаеньне. Кантрактацыя будзе выканана на 100 проц., калі ў райён будзе дастаўлена яшчэ 25 тон. суперфасфату.

Калектывізацыя праходзіць добра. З'арганізавана: 1 пасялковае, 1 жывёлаводчаскае, 1 машыннае т-вы і 1 с.-г. арцель, а галоўнае, вядзецца абслугоўваньне аб'яднаньняў, арганізаваных у вясеньнюю насеўную кампанію.

З групавымі садамі справа стаіць добра: ужо заспавана, зроблена разьбіўка плошчы і выкапаны ямы ў двух калгасах на плошчы 2 гэктары і ў двух пасёлках на плошчы 6 гэктараў.

Пасялкоўцы імкнуцца да арганізацыі групавых садоў, бяда толькі, што мала адпушчана крэдыту, усяго 500 рублёў на райён.

Заложана 15 вопытна-паказальных вучасткаў, па праграме інстытуту сяляні-дасьледчыкаў, з штучным угнаеньнем. Вучасткі заложаны ў 6 калгасах і 2 пасёлках.

Пераведзена на шматпольле 5 калгасаў з плошчаю 2000 гэктараў і 2 пасёлкі на плошчы 300 гэктараў, апрача гэтага вядзецца праверка выкананьня пераходных плянаў у вёсках раней перайшоўшых да шматпалёвых севазваротаў.

Аграном Калечыц.

Бярэзінскі р., Меншчына.

Шчырае дзякуй за добрую працу.

(Ляднансі р. Аршанскай акругі).

Расткоўскі камітэт сялянскай узаемадапамогі за апошні час вельмі добра наладзіў сваю працу. Камітэт правільна разьмеркаваў хлеб сярод беднаты свайго райёну, таксама правільна разьмеркаваў 13 дзесяцін сенажаці.

У камітэце маюцца і сельска-гаспадарчыя прылады: малатарня, веялка, акучнік і інш. якія даюцца беднаце дарма.

Каб ня было гэтых машын, дык бедняку прыходзілася-б прасіць у кулака за вялікія грошы.

Шчырае дзякуй прыносіць уся беднота свайму дапаможніку—камітэту сялянскай узаемадапамогі.

М.

КАМУНА „ШЛЯХ СЕЛЯНІНА".

(Да конкурсу на лепшы ураджай).

Я хачу расказаць толькі пра адну галіну з жыцьця камуны—пра барацьбу за лепшы ўраджай і пра тую перамогу, якую яны атрымалі ў глухім, далёкім ад цэнтру, кутку.

Два гады таму назад камунары паставілі сабе мэту, чаго-б ні каштавала, якія-б на гэта ні былі затрачаны сродкі, дамагчыся падвойнага ўраджаю. Што гэтыя 60 пуд. жыта з угноенай дзесяціны? Нашта зямля можа даць болей! У ёй закладзены вялікія багацьці, але мы іх ня можам узяць. Мы прызвычаены бачыць толькі тое, што сёньня можна ўзяць рукамі. А тое, чаго ня відаць, што захавана хоць-бы і недалёка ў зямлі—хай там волата, хай там што-небудзь даражэйшае,—мы таго ня бачым.

— Апрацоўвайце лепш зямлю, рана ўзорвайце папар, добра даглядайце за ім улетку, рабіце зяблёвае ўзорваньне, сейце адсартаваным зярном, заводзьце шматпольле, канюшыну, рабіце цёплымі пуні, рабіце, рабіце, рабіце...—гэтыя словы агранаміі былі «гласом вопиющего в пустыне». Мора дробнаўласьніцкіх гаспадарак ня слухала агітацыйных заклікаў агранаміі, жыло на трохполцы, карміла „дурня ад Юр'я да Юр'я", пачынала сеў у «вялікую суботу», пачынала жніва з «казанскай божай мацеры», трымала збожжа на полі да „зьдзьвіжаньня", акрапляла жыта ў засушлівы год «сьвятою вадзіцай» і жыло ў закураных, дымных хатках.

Даклады, лекцыі, «сухія» запяткі сельска-гаспадарчых гурткоў—усё гэта не здавальняла сялянства. Селянін слухае даклад, пачухвае патыліцу ды пачынае: «Што вы трэпеце, таварышы, што вы? Зрабіце так, каб я змог памацаць, перавярнуць ваш дзесяцифутовы бурак. Зрабіце так...»

Мсьціслаўскія аграномы задумаліся, што рабіць? Як паказаць селяніну выгаду шматпольля, канюшыны, штучнага ўгнаеньня, паказаць так, каб ён навочна ўпэўніўся ў выгаднасьці ўсяго гэтага.

* * *

Адказ на гэта складанае пытаньне дало само жыцьцё. Арганізаваўся калектыў «Шлях селяніна». Камунары таксама біліся над гэтымі пытаньнямі. Запрасілі на дапамогу агранома. Разам сумольна працаваць над павялічэньнем ураджаю.

Узімку, калі вецер ваўком вые на вуліцы, в сялянамі вёў гутаркі аграном. Сур'ёзна прапрацоўвалі пытаньні далейшай працы. Альбо падвойны ўраджай, альбо... альбо камуна разыйдзецца. Гэтыя два полюсы не давалі спакойна працаваць камунарам. Альбо... альбо,—два адноль каўскіх словы, а яны дорага каштавалі камуне.

З надыходам вясны, калі сьнег растаяў на палёх і рэчкі забурэлі вясеньнім шумам, камунары ўзяліся за працу. Першая праца—раньняе ўзорваньне папару. У канцы красавіка ўвесь папар быў узьняты.

Праз месяц, калі на ім паказаліся першыя расткі травы, папар выскараджалі. А к «пятрову дню», калі звычайна сяляне пачынаюць узьнімаць папар, папар у камуне быў выскараджан у другі раз.

Каля калектыўнага „чорнамазага папару" знаходзіўся сялянскі папар. Не зямля, а апаленая цэгла сялянскага папару марудна ўзьнімалася над аднаконным плугам. Канька ледзь-ледзь цягнуў непасільную кладзь.

Папар камуны скародзіўся праз вызначаны тэрмін усё лета. Камунары не давалі разьвівацца ніводнай травінцы—як толькі пакажуцца расткі—пад барану іх.

За два тыдні да засеву папар быў узьнят. Глеба рассыпалася гарохам. А сялянскі папар, так званы «пятроўскі», клаўся з-пад плуга доўгімі стужкамі-„скавародзінкамі"; як называлі іх тыя-ж самыя сяляне.

Падрыхтаваўшы належным чынам глебу, зрабілі раньні засеў (у канцы жніўня), як раіў ім райённы аграном. Насеньне для засеву было адсартавана і апроч гэтага, хоць і мясцовае, але лепшага гатунку (абмянялі ў бліжэйшым савгасе). Рунь узыйшла квяцістая, буйная, прарочачы добры ўраджай-зарплату за пакладзеную ў ніву працу. У процілегласьць укараніўшымся сялянскім традыцыям забаранілі пасьвіць жывёлу ўвосень па руні. Колькі крыку, колькі гарнідару было з-за гэтага!..—Прапала жыта!.. крычалі старажылы.—Так аграном раіць, а калі раіць, дык недае!—адказвалі маладыя. Урэшце такі была зроблена пастанова аб забароне пасьвіць жывёлу.

Коўдра сьнегу захавала зялёную рунь. У камунараў больш вольнага часу. Зноў вечары за газэтамі, за кніжкай, за лекцыяй аграном.

* * *

Вясною гэтага году жыта было выскараджана.

— Як? вы жыта скародзілі? Дзе вы расьлі? У балоце? Ай людзі, людзі...—сьмяяліся сяляне суседніх вёсак. А і сапраўды, поле камуны было з чорнымі плямамі. Чалавеку, ня ведаючаму «ні бэ ні мэ» ў вядзеньні сельскай гаспадаркі, магло здавацца, што ў кіраўнікоў камуны ня ўсе клёпкі ў галаве. Але і людзі, якія працавалі ўвесь век на зямлі, маючыя за плячыма пяцідзесяцігадовы «сельска-гаспадарчы стаж», і тыя сьмяяліся.

— Што-ж, сьмейцеся: Крупень (райаграном Мсьціслаўшчыны) не падвядзе,—адказвалі камунары на жарты суседзяў—аднасялчан.

Упяршыню на Мсьціслаўшчыне пасыпалася селітра і суперфасфат з рук камунараў на жытнюю рунь. Чылійскай салітры было расьсеена на дзесяціну шэсць пудоў і суперфасфату 16 пуд. Далі, што называецца, панюхаць беларускаму жыту замежнага, «кіпанковага» ўгнаеньня. Зноў жартавалі неўгамонныя суседзі;—Гною-б сюды, гною, а ня фунт нейкога тытунёвага пылу.

— Сьмейцеся; не супярэчым, — не жадаючы спрачацца адмахваліся камунары, калі ўжо ніяк нельга было ўпэўніць «бараду»!

Праходзілі—зялёнакудры май, мяккі чэрвень, золататканы ліпень. Падыходзіў час жніва. Сяляне снынілі свае неабгрунтаваныя жарты: можна было раней упэўніцца, што гэтае жытняе каласістае мора не падвядзе камунараў.

Хаця са спазьненьнем сёлета, але, урэшце, такі пачалося. Клалі ся п'янымі снапы жыта, вырасталі постаці коннаў. Тоўстая сьцяна камунаравага жыта сьпявала песьню аб вялікім ураджаі, а поруч толькі праз мяжу—жыдзенькія каласы сялянскага жыта аплакралі нядбайнасьць свайго гаспадара. Аграномія зацікавілася гэтымі дзьвюма супроцьлегласьцямі—зрабіла ўзьвешваньне. Пры падрабязным аналізе аказалася, што ўраджай у камуне з дзесяціны паўтараста пудоў, а ў сялян, самае вялікае,—пяцьдзесят адзін пуд.

... Хіба не сьняваць аб гэтым сёньня, хіба не хваліць камуну «Шлях селяніна», якая ўпарта змагаецца за лепшы ўраджай, за лепшае жыцьцё?

Наша сялянства, наша беларуская вёска ня так многа ўдзяляе ўвагі тэхнічным культурам—лёну, бульбе, канаплі і інш. У расьліні гэтых—вялікае будучае. Хоць-бы ўзяць прыклад у гэтай-жа самай камуне „Шлях селяніна". У гэтай камуне засеена каля трох дзесяцін лёну. Лён выбран і аграном таксама зрабіў аналіз ураджайнасьці. Дзесяціна сёлета дала 35 пудоў кудзелі... Гэта таксама дасягнута шэрагам культурных мерапрыёмстваў—належнай апрацоўкай глебы з асеньнім узьняцьцем папару, пасеву адсартаваным насеньнем, належнай культурнай пабудовай структуры глебы і шмат іншых мерапрыёмстваў. 35 пудоў кудзелі, лічачы пуд па 10 руб. —350 р. з дзесяціны валавога прыбытку, нават ня лічачы ў гэту лічбу насеньня. Пры сялянскім, звычайным у Беларусі, прыбытку з дзесяціны ў 50-60 руб. гэта вялікае дасягненьне, вялікі прыжок на шляху павышэньня ўраджайнасьці. Гэта лічба, гэты маленькі прыклад павінен заставіць прызадумацца наш вясковы актыў, нашых працаўнікоў с.-саветаў, хат-чытален, настаўнікаў, увесь партыйны і камсамольскі актыў. Мы павінны заразжа распачаць шырокую агітацыю ў весцы, зьвязваючы гэта з падрыхтоўкай да „дню ўраджаю" па папулярызацыі тэхнічных культур, бо ад іх пашырэньня залежыць і ліквідацыя „лішніх" рук у вёсцы, залежыць уся эканоміка нашай сельскай гаспадаркі, залежыць здаваленьне сыравінай фабрык.

Здрыяты новага кінуты. Мы павінны пачаць ад іх вучыцца, як пачалі мсьціслаўскія сяляне хадзіць у камуну „Шлях селяніна" за парадамі ў вядзеньні сельскай гаспадаркі. Селяніна ня возьмеш „сухой" лекцыяй. Дайце яму пашчупаць, перавярнуць з рукі на руку, і тады ён пойдзе з вамі. Гэта даказвае той-жа „Шлях селяніна".

Цім. Зарэчны.

Кіруючы склад КСТУ ... ецца наступнымі данымі: па сацыяльнаму становішчу—беднякоў 58,4 проц., сераднякоў—27 проц., заможных—0,3 проц., сельска-гаспадарчых рабочых—1,3 проц., служачых—3 проц.

Матар'яльнае становішча камітэтаў СТУ з кожным годам узмацняецца, што відаць з наступнага: на 1-10-25 г. было фондаў—156637 пуд. збожжа і 95133 руб. грашыма, а на 1-4-28 г. было 420582 пуд. збожжа і 280015 р. грашыма, прычым галоўнымі крыніцамі стварэньня і павялічэньня фондаў выяўляюцца сяброўскія ўзносы—на 30 проц., прыбыткі ад прадпрыёмстваў—40 проц., іншыя—10 проц. Прадпрыёмствы, дапаможных сельскай гаспадарцы, якія накіраваны на абслугоўваньне, падняцьце і дапамогу бядняцкім гаспадаркам, было на 1-10-1925 г. 344. У сучасны момант масцца 347.

Пракатных пунктаў было ў 1925-26 г.—99, у іх машын—794; зараз маецца (на 1-4-28 г.)—50, у іх машын—2509.

Злучных пунктаў было ў 1924-25 г. 3, з лікам жывёлы ў іх—5. Зараз маецца—30, з лікам жывёлы ў іх—47.

Аказана матар'яльная дапамога бядняцкім гаспадаркам, сем'ям чырвонаармейцаў, удовам, сіротам і інвалідам у 1924-26 г.—63848 гаспадаркам; патрачана 231394 руб., ці на адну гаспадарку з р. 60 к.; у 1925-26 г. аказана дапамога 73327 гаспадаркам, гаспадаркам. Аказана дапамога праз пракатныя пункты ў 1924-25 г.—35524 гаспадаркам, у 1926-27 г.—125376 гаспадаркам і за паўгодзьдзе 1927-28 г.—99418 гаспадаркам.

У галіне каапэраваньня і калектывізацыі прароблена наступная праца: каапэравана беднаты за ўласныя сродкі ў 1924-25 г.—9736 гаспадарак і за паўгодзьдзе 1927-28 г.—4944 гаспадаркі, усяго 34700 гаспадарак. Арганізавана рознага роду вытворчых і прадпэўных т-ваў і арцеляў за апошнія паўтара гады 938, у іх аб'яднана беднякоў і сераднякоў 27798 чалавек.

Апроч таго, пры ўдзеле і дапамозе сялянскае ўзаемадапамогі каапэрацыйнымі арганізацыямі каапэравана беднаты, за рахунак фонду каапэраваньня апошняй, за паўтара гады 119106 гаспадарак.

Усе гэтыя лічбы цалкам паказваюць, што ў працы сялянскай грамадзкай узаемадапамогі «ёсьць пэўныя дасягненьні ў галіне ахопу бядняцка-серадняцкіх пластоў сялянства і адначасова з гэтым ёсьць дасягненьні ў каапэраваньні бядняцкіх гаспадарак, арганізацыі сельска-гаспадарчых калектываў, розных вытворчых арцеляў, прадпрыёмстваў, пракатных і злучных пунктаў, павялічэньне насеннага і грашовага фондаў і аказаньне дапамогі беднаце. Але разам з гэтым трэба адзначыць, што дасягнутыя вынікі зьяўляюцца недастатковымі. Галоўныя недастаткі ... ...

...ыкамі; у большасьці т-ваў адсутнічаюць пляны працы і нездавальняюча пастаўлена рахункаводзтва і справаводзтва, рэдкае і няпланавае інструктаваньне сельскіх т-ваў з боку райённых старшынь і акруговых упаўнаважаных т-ваў; недастатковая арганізацыя і аказаньне т-вамі працоўна-грамадзкай дапамогі незаможным сем'ям чырвонаармейцаў, інвалідам і беднаце; нездавальняюча пастаўлена праца рэвізійных камісій; нездавальняючая падрыхтоўка беднаты і батракоў да перавыбараў т-ва, у выніку чаго пакатарыя т-ны мала працаздольны; слабае кіраўніцтва т-вамі з боку сельсаветаў і райвыканкомаў; вельмі слабае спагнаньне т-вамі сяброўскіх узносаў і пазычак.

Трэба адзначыць, што далейшая праца ў гэтым кірунку не павінна паслабляцца, прычым трэба асаблівую ўвагу зьвярнуць на наступныя мерапрыёмствы: на калектывізацыю бядняцка-серадняцкіх гаспадарак вёскі, арганізацыю т-ваў па супольнай апрацоўцы зямлі, машынных, малочных і інш. арцеляў, а таксама і каапэраваньне беднаты ва ўсе віды каапэрацыі, асабліва па лініі сельска-гаспадарчай і г. д.

На працу сялянскай грамадзкай узаемадапамогі павінна быць зьвернута належная ўвага з боку акруговых і райённых выканаўчых камітэтаў і сельсаветаў.

Арапучык.

...мантаваны шляхі коштам 120 р. Зараз пачаўся капітальны рамонт Слаўнянскай школы, на якую адпушчана 334 руб. 35 кап. Усе сродкі па сельсавету вы...

...шляхамі, ...скімі пунктамі, дзіцячымі пляцоўкамі і хатамі-чытальнямі будзе пабудавана.

Ворша.

Правялі новае самаабкладаньне.

Па ўсяму Дзякавіцкаму сельсавету самаабкладаньне праведзена на 35 проц. падатку.

За сродні самаабкладаньня пабудавана 6 новых мастоў, 3 масты будуюцца, канчаецца рамонт Чырвона-Пасялноўскай школы, адрамантавана Дзякавіцкая школа.

У школах праведзены даволі значныя рамонты: штукатурка па ўсіх пакоях, пачынка і падсьпіхна падлог, пабудова печак.

Засталося толькі пабудаваць у вёсцы тратуар і ўся пастанова сходу будзе выканана.

Сяляне бачаць, што іх пастановы праводзяцца ў жыцьцё і вельмі здаволены гэтым.

Таму сяляне на сваім апошнім сходзе адзінадушна пастанавілі правесьці калектыўна за свае сродні ачыстку і копку канаў на балоце. Пастанова гэта ўжо праводзіцца ў жыцьцё. 2 канавы ўжо ачышчаны. У дзень выходзіць на працу больш 200 чалавек.

Сяляне ўжо ня слухаюць заможных, янія і на апошнім сходзе зрабілі спробу сарваць новае самаабкладаньне. Цесна згуртаваўшыся, беднякі і серадняні далі ім дружны адпор.

Ц. А.

Старобінскі р., Бабруйшчына.

Вельмі здаволены...

Ужо так здаволены грамадзяне, вёскі Астрэць, што нарэшце, пабудован вельмі добры мост без якога некалькі гадоў проста мучыліся.

Але бяда ў тым, што з аднаго боку маста зроблена насып, а з другога—толькі навожана гальлё, ды не засыпана.

Трэба хутчэй засыпаць гальлё зямлей і зрабіць гэта ня цяжка, бо ёсьць яшчэ шмат двароў, якія ня выпаўнілі самаабкладаньне.

Каб было добрае кіраўніцтва, дык ужо ўсё даўно было-б зроблена.

В.

Галавенчыцкі с.-с.
Чавускага р.

Чаму трымаюць у кішэні грошы?

(Вузьдзенскі с.-с., Меншчына).

Шэраг цяжкасьцяў прышлос... рамагчы кіруючым установам, ... весьці самаабкладаньне ў той ... шай вёсцы. Але ўсё-ж такі ... кладаньне прайшло па ўсіх ... Грошы пачалі вьбірацца цераз ты... пасьля сходу, на якім правялі сам... абкладаньне.

Добра было-б, калі-б с.-с. на сабраныя грошы будаваў тое, што пастанавілі сялянскія сходы. Але, на жаль, гэта было ня так.

Старшыня с.-с. Лычкоўскі сабраныя грошы трымае ў кішэні і не аддае на рамонт пажарных сараяў, школ і г. д. Цяпер, калі працоўную сілу можна выкарыстаць на дабрабыт вёскі, с.-с. гэтага ня робіць. Нагляду за сабранымі сродкамі няма ніякага, таксама няма нагляду і за расходваньнем іх. Рэвізійныя камісіі і сельскі актыў кажуць, што гэта ня іх справа. С.-с. не вызначае поўнасьцю сродкаў у тую ці іншую вёску, а гаворыць: бярэце невялічкія грошы. Вёскі бяруць, але ня ўсе, а толькі тыя, якія моцна крычаць—«давай грошы». Старшыня-ж сельсавету і галавою ня шамае.

І дакуль так будзе?

Л. М.

Сьпяць яны, ці што?

Савгас «Леніна» ў м. Смалявічах мае ня дрэнны выгляд: ёсьць там партыйцы і камсамольцы. Аднаго толькі няма—культурнай працы. Сярод рабочых надвычайна разьвіта лаянка. Таксама назіраецца п'янства, і п'юць нават партыйцы.

25-8 г. г. у суботу савгасавскія жанчыны сабралі па 50 кап. і наладзілі вечарынку, на якой галоўнае месца на стале займала гарэлка. Цэлую ноч на дварэ і ў хаце чутна была лаянка і крыкі. Мужчыны з мястэчка ўбачылі, што жанчыны п'юць, далучыліся да іх і, такім чынам, амаль усе перапіліся. Добра яшчэ, што не пабілі і не паламалі нічога, і не нарабілі пажару. Цікава, што скажа на гэта адміністрацыя савгасу і саюзу?

Б. Дзяруга.

мае ён аб ім і днём і ноччу таму, што сельсаветы заставілі яго думаць аб ім, а ня вучыцца.

Як толькі прыбылі пераменьнікі ў полк, дык кожны палітыкіраўнік цэлую торбу набіваў пасьведчаньнямі аб водпуску дамоў. Асабліва шчодрымі аказаліся з бярэзінскага райёну старшыні Дзьмітравіцкага і Арэшкаўскага с.-с. У Дзьмітраўскіх пераменьнікаў няма подпісаў на пасьведчаньнях сэкратара сельсавету. Калі я запытаўся ў пераменьнікаў аб гэтым, дык яны мне адказалі: „Пасьведчаньняў не падвучвае. Мясцовым арганізацыям патрэбна не абмяжоўвацца выдачаю пасьведчаньняў, аб водпуску, а арганізоўваць рэальную дапамогу сям'і таго пер-ка, у якога няма каму працаваць. Лепш было-б каб замест пасьвядчаньня, пер-к ведаў, што яго сям'і скосяць сенажаць альбо пасеюць жыта і г. д. Вось гэтак і трэба будзе ў далейшым арганізоўваць дапамогу сем'ям перскладу, што падыме ня толькі баяздольнасьць палка, але і аўтарытэт і сельсаветаў і іншых мясцовых арганізацый.

Чэрнікаў.

З прызывам падцягнуліся.

(Уваравіцкі райён, Гомельшчына).

У апошнія часы сельсаветы Уваравіцкага райёну палепшылі падрыхтоўчую працу прызыву 1906 году. Яшчэ ў жніўні месяцы некаторыя з іх не паведамілі нават прызыўнікоў аб зборы на канфэрэнцыі, не растлумачылі аб своечасовай яўцы на прызыўныя пункты і г. д. Не клапаціліся аб гэтым парт'ячэйкі і камсамол.

Спачатку верасьня ў шэрагу сельсаветаў ужо праведзены канфэрэнцыі прызыўнікоў на якіх абгаварваліся пытаньні аб задачах прызыву і міжнародным становішчы.

На канфэрэнцыях абіраліся прадстаўнікі прызыўнікоў для ўдзелу ў жараб'ёўцы.

У Чабатавічах прызыўнікі запэўнілі сельскі савет у тым, што сярод іх ня знойдзецца ніводнага дэзэртыра і ўсе яны своечасова зьявяцца на прызыўныя пункты.

— На прызыўных пунктах няма ні п'яных, ні хуліганаў, кажуць прадстаўнікі сельсаветаў. Настрой сярод прызыўнікцў бадзёры. Шмат хто з іх адмаўляецца ад ільгот.

В. Салдаценка.

НЕ ПАЎТАРАЦЬ СТАРЫХ ПАМЫЛАК.

У 1927-28 г. усе загатоўчыя арганізацыі БССР ня толькі вялі загатоўку пушніны, але і самі экспартавалі гэты тавар і ясна, што „ад сямі нянек дзіця без вокі заставалася", бо можна быць добрым загатоўцам, можна дасканала разьбірацца ў пушніне і ў той-жа час можна быць вусім слабым экспартэрам. Натуральна, што вялікая колькасьць экспартэраў пушніны не дала станоўчых вынікаў, бо Белкаапсаюз і Белсельсаюз, якія ўпяршыню вялі такую загатоўку, упяршыню ўзяліся і за экспарт, калі ж Белдзяржгандаль ужо больш сямі гадоў вядзе экспарт, вывучыў рынак, ведае „капрызы" пакупцоў і кан'юнктуру рынку. Паступленьне на замежны рынкі беларускай пушніны ад розных арганізацый выклікала зьніжэньне рэалізацыйных цэн, стварала такое становішча, пры якім нижа было разьбірацца, бо, натуральна, пушніна розных арганізацый парознаму сартавалася, парознаму пакавалася, а гэта ў выніку адбілася на агульным продажу беларускай пушніны.

Так было ў 1927-28 г. Зараз, напярэдадні пушной кампаніі, гэта памылка ўжо ўлічваецца: пачынаюць гаварыць аб немэтазгоднасьці экспарту пушніны ўсімі загатоўцамі. Тут маецца яшчэ адзін вельмі важны і сур'ёзны момант. Паміж загатоўцамі пушніны заўсёды існавала варожасьць, заўсёды мела месца канкуренцыя, цэны заўсёды ня былі пагоджаны, ня гледзячы на тое, што Наркамгандалем БССР цэны на пушніну былі ўстаноўлены для ўсіх аднолькавыя. На глебе канкуренцыі заўсёды ўзьнікалі складаныя непаразуменьні, заўсёды былі скаргі, нараканьні, штрафы, выгавары і г. д. Усе гэтыя моманты ў сучасны момант, перад новай кампаніяй, бяруцца пад увагу, і ставіцца пытаньне аб канцэнтрацыі экспарту пушніны толькі ў адных руках. Зразумела, загатоўку пушніны павінна весьці ў першую чаргу каапэрацыя, якой ужо пара прызвычаіцца да загатоўкі экспартных тавараў; далей вядзе загатоўку пушніны таксама Беларускі Паляўнічы Саюз, а пасьля Белдзяржгандаль, якому, мабыць, будзе перададзен увесь экспарт БССР.

Гэтым спосабам будуць дасягнуты лепшыя вынікі, бо вопыт і практыка мінулага апэрацыйнага году паказалі ўсю слабасьць і нятрываласьць мэтаду экспарту пушніны ўсімі загатоўцамі.

І толькі таму, што гэты від экспарту мае добры збыт на замежных рынках, што нашай пушнінай цікавяцца—зусім няма ніякай патрэбы, каб усе займаліся экспартам, і будзе значна лепш, калі гэтай справай будзе займацца экспартэр БССР—Белдзяржгандаль. Апроч таго, шляхам канцэнтрацыі экспарту ў адных руках мы, урэшце, зьнішчым усе тыя ненармальныя зьявішчы, якія існавалі на пушным рынку.

Усе яшчэ памятаюць загатоўкі мінулага году, калі мелі месца нездаровыя зьявішчы і за адным лісам ганялася каля 15 агентаў розных дзяржаўных арганізацый. І калі экспарт будзе ў адных руках, калі будуць вызначаны цэны, па якіх пушніна будзе здавацца аднаму экспартэру, тады, зразумела, нам удасца пазбавіцца шмат якіх памылак і адначасова павысіць рэнтабельнасьць і якасьць пушніны ў БССР.

Леўскі.

...ьнят-
...годзьдзя БССР
...ня. На выстаўцы будуць прадстаўлены шэраг карцін і скульптур, якія будуць маляваць гістарычныя моманты: „Падпісаньне маніфесту аб агалашэньні БССР", „Чытаньне маніфэсту", „Акупацыя БССР», «Партызаншчына» і інш. Зацікаўленыя мастацкія карціны і скульптуры будуць выдадзены прэміі. Выстаўка будзе адчынена на працягу ўсяго студзеня м-да.

Усебеларускае аб'яднаньне мастакоў зьявярнулася да мастакоў з заклікам прыняць удзел у арганізацыі гэтай мастацкай выстаўкі.

Тэхнікум фізкультуры.

Каб паставіць на належную вышыню кіраўніцтва фізічным разьвіцьцём вучнёўства, у 1929 годзе ЦКАсьветы мяркуе адчыніць спэцыяльны Тэхнікум Фізкультуры.

К—к. Магілеўшчына. Ваш допіс «Хто нашы студэнты» пераслалі ў Наркамасьветы дзеля рассьледваньня Аб выніках паведамім.

К—ку. Горкі. С.-г. акадэмія. «Дваццаць сем і трыццаць» пераслалі ў Наркамасьветы.

А. М-у. Полаччына. Ваша карэспандэнцыя „Страшэдла" была пераслана Полацкаму акр. інспэктару асьветы на рассьледаваньне. У выніку, выкладчык прыродазнаўства Вобальскай школы з пасады зьнят.

БАБРОЎСКАМУ. Жлобін. На вашу карэспандэнцыю «Настаўнікаў п'яніц — за вушко ды на сонца» Бабруйскі акр. інспэктарыят асьветы адказвае, што настаўнік Латышкевіч з працы зьнят.

РЫГОРУ НЯДОЛЯ, Ваша апавяданьне «Комплекс» пераслалі ў часопіс «Маладняк». Апавяданьне «Жыцьцё кліча» скарыстаем.

кампаніі ЦК саюзу на год.
2. Аб перавыбарах групкомаў, мясцкомаў, прафкомаў і прафдэлегатаў.
3. Аб разукрупненьні групкомаў.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня, 22 верасьня, кіно „Ловкие девицы". Пачатак сэансаў 8 і 10 гадзін.

23 верасьня пастаноўка Бел. Дзярж. Тэатру Галубка: «Краб».

ПРЫ АГІТПРОП. ГАБІНЭЦЕ АДЧЫНЕНА РЭГІСТРАЦЫЯ ТАВАРЫШОЎ, ЖАДАЮЧЫХ ЗАЙМАЦЦА Ў НЯДЗЕЛЬНЫМ КАМБУЗЕ. РЭГІСТРАЦЫЯ ПРАВОДЗІЦЦА ШТОДНЯ АД 6 ДА 10 ГАДЗ. УВЕЧАРЫ.

Часова вык. абав. адказнага рэдактара
П. ШАСТАКОЎ.

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС

Дзяржаўнай абутковай фабрыкі „САМАХОД"

Інспэктарыяту мясцовай прамысловасьці Віцебскага Акруговага Выканаўчага Камітэту на 1 кастрычніка 1927 г.

АКТЫЎ. *ПАСЫЎ.*

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ.	Сума прыватная.	Сума агульная.	% да балянсу.
I. Грашовыя сродкі і каштоўныя паперы:			
Каса	245—75		
Бягучыя рахункі	9598—93		
Пі	358—65		
Аблігацыі дзярж. пазыкі	804—66	11007—99	3,14
II. Матар'яльныя каштоўнасьці:			
Асноўныя матар'яды	36390—16		
Дапаможныя „	1733—23		
Інструм., служ. меня году	2874—81		
Паўфабрыкаты	7371—28		
Гатовыя вырабы на складзе	51919—81		
„ „ у магазыне	9739—23	110028—52	31,44
III. Маемасьць.			
Тэхнічнае абсталяваньне	12887—99		
Інструманты і інвэнтар	3397—32		
Мёртвы інвэнтар	582—01	16867—32	4,82
IV. Наскончаныя апэрацыі:			
На вытворчасьці	40261—35		
На капітальных рамонтах	652—02	40913—37	11,69
V. Дэбіторы:			
Прадаўцы і пастаўшчыкі	1580—81		
Пакупцы і спажыўцы	39064—50		
Рабочыя і служачыя	10785—45		
Няпэўныя даўгі	6373—32	57804—08	16,51
VI. Абавязацельствы і дакументы да атрыманьня:			
Вэксалі ў партфэлі	11960 —		
» на вучоце	96347—14		
» пратэставаныя	157—28	108464—42	30,99
VII. Выдаткі будучага справаздачнага перыяду		4871—89	1,41
БАЛЯНС		349957—59	100

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ.	Сума прыватная.	Сума агульная.	% да балянсу.
I. Капіталы:			
Статутны	115298—17		
Амартызацыйны	3967—14	119265—31	34,07
II. Рэзэрвы:			
Рэзэрв няпэўных даўгоў		6530—60	1,86
III. Пазыкі, ссуды і крэдыты:			
Банкі па вучоту вэксалёў	96347—14		
Доўгатэрмін. ссуды па Прамфонду	2000 —	98347—14	28,13
IV. Вэксалі выдадзеныя		75430—11	21,55
V. Крэдыторы:			
Дастаўшчыкі і падрадч	359—52		
Пакупцы і спажыўцы	5839—09		
Рабочыя і служач.	7126—48		
Розныя крэдыторы	9825—28	23150—37	6,65
VI. Пэрыбытак за справаздачны перыяд		27234—06	7,79
БАЛЯНС		349957—59	100

ДЭБЕТ. **Рахунак прыбыткаў і выдаткаў.** **КРЭДЫТ.**

Від страты.	СУМА.	Проц. да агульн. сумы.
Гандлёвыя выдаткі	24183—45	32,45
Адміністрацыйныя выдаткі	17862—12	23,97
Пістачы	107—04	0,14
Рэзэрвы на сьнісан. няпэўн. даўгоў	1224—27	1,64
Упэўка тавараў	1—96	0,002
Розныя	3920—90	5,26
Чысты прыбытак	27234—06	36,54
БАЛЯНС	74533—80	100

Від прыбыткаў.	СУМА.	Проц. да агульн. сумы.
Прыбытак ад рэалізацыі прадукцыі	60733—78	81,49
Прыбытак ад зысканьня няпэўн. даўгоў	316—86	0,42
Розныя	13483—16	18,09
БАЛЯНС	74533—80	100

Дырэктар фабрыкі БУДОУНІЧ.
Галоўны бухгальтар ГІРШБЛОНД.
Баланс зацьвэрджаны: Заг. Віц. Акрфа ФАЙНГАУЗ.
19-VII—28 г. Інспэктар непадатковых прыбыткаў ІВАНОЎ.

КІНО.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». Ад аўторка 18 верасьня, сучасная штодзённая драма ВЫТВОЧАСЬЦІ БЕЛДЗЯРЖКІНО **„У ВЯЛІКІМ ГОРАДЗЕ"** У галоўных ролях: С. Якаўлева, Г. Маліноўская, Р. Бабынін. Пачатак 1-га сэансу а 7 г, 15 хв., 2-га у 9 г. і 3-га ў 10 г. 45 хв.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Ад аўторка 18 верасьня, новы мастацкі фільм **„ЦЫГАНСКАЯ КРОЎ"** у 7 частках. СЭАНСЫ—пачатак 1-га а 7 гадз. 30 хв., 2 — а 9 гадз., 3—а 10 гадз. 30 х. Каса адчынена ад 6 гадз.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». АД АЎТОРКА 18-га ВЕРАСЬНЯ, МАСТАЦКІ БАЯВІК З ЖЫЦЬЦЯ Ў КАНАДЗЕ. **„ВЕЧНАЯ БАРАЦЬБА"** драма ў 8 частках. Пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 хв. Каса адчынена ад 6 г.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». З аўторка, 18 верасьня Вялікі мастацкі баявік **«ЗЯМЛЯ У ПАЛОНЕ»** мастацкі фільм у 7 частках. У галоўных ролях лепшыя савецкія кіно-артысты: В. Фогель, А. Стэн, А. Суднкевіч, Каваль-Самборскі, Баталаў, Нарокаў, Якаўлева і інш. Пастаноўка рэжысэра Ф. А. Оцэпа. З сэансы пачатак 1 а 7 г. 30 х.

Пастанова

МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА САВЕТУ

ад 6-га верасьня 1928 г.

АБ УНЯСЕНЬНІ ЗЬМЕН У „ПАЛАЖЭНЬНЕ АБ РАБОЦЕ ДВОРНІКАЎ".

Менскі Гарадзкі Савет пастанаўляе:

1. Рэдакцыю артыкулу 3 Палажэньня аб рабоце дворнікаў па аказаньню дапамогі Міліцыі ў справе нагляду за парадкам» (апублік. у газэце «Савецкая Беларусь» № 113—1926 г.) зьмяніць наступным чынам:

„3. Мясцоваму Аддзяленьню Міліцыі надаецца права матываванага адводу як прынятых нанова па пасаду дворнікаў, так і ўжо працуючых з захаваньнем вымаганьняў п. «в» арт. 47 К. З. аб Працы".

2. Увагу да артыкулу 4 гэтага-ж «Палажэньня» адмяніць.

Нам. Сдаршыні Менскага Гарадзкога Савету РАБІНОВІЧ.

ЧВА Сакратара Менскага Гарадзкога Савету ГУРВІЧ.

Судовы выканаўца 2 вуч. Менскай акругі

АБВЯШЧАЕ,

ШТО 27-га ВЕРАСЬНЯ 1928 Г. А 10-й ГАДЗІНЕ РАНІЦЫ

АДБУДЗЕЦЦА

продаж з ПУБЛІЧНАГА ТОРГУ

будынку гр-на Юнеса Рафаіла па Падзамкавай вул. д. № 15, які складаецца з пэглянага 2-хаверхавага дому. Ацэнка да торгу 2000 руб. на спагнаньне па судовому загаду і выканаўчаму лісту Нар. суда 2 вуч. Менскай акругі 350 руб. Камунбанку і 130 руб. гр. Эпштэйну.

27 верасьня 1928 г. а 12 гад. дню адбудзецца продаж маемасьці гр. Лошыцэра Лейбы, якая знаходзіцца ў Менску па Нямігскім завулку д. № 10 і складаецца з папяросных каробак. Ацэнка да торгу 2400 руб. на спагнаньне 600 руб. Камгасу і 1000 руб. МЦРК згодна выканаўчага лісту Мен. акр. суда.

27 верасьня 1928 г. а 3 гадзіне дню адбудзецца продаж будынку гр. гр. Кагана Кушэля Айзікава і Кагана Шолама Явкелева па Нова-Татарскай вул дом № 17-14, які складаецца з драўнага дому і хлева. Ацэнка 550 р на спагнаньне 450р. у карысьць Мазэль згодна судовага загаду Нар. суда 2 вучастка Мен. акр.

29 верасьня 1928 г. а 10 гадзіне раніцы адбудзецца продаж будынку гр. гр. Вэргуна Пятра Савасьцянава па Нова-Камароўскай вул. д. № 25-а які складаецца з драўнян а дому з дабудовай. Ацэнка ў 619 р. на спагнаньне сродкаў на утрыманьне 3-х дзяцей згодна выканаўчага лісту Нар. суда 2 вучастку Менскай акр.

29 верасьня а 12 гадзіне дню адбудзецца продаж будынку гр. гр. Сіпа Антона Язэпава па Барысаўск. гракту д. № 77 які складаецца з драўнага дому Ацэнка 450 р, на спагнаньне 180 р. у карысьць Клеванскага, згодна судовага загаду Нар. суд. 2 вуч. Мен. акр.

Жадаючыя таргавацца запрашаюцца ў вызначаныя часы на месца знаходжаньня маемасьці да пачатку торгу. У выпадку калі першыя таргі не адбудуцца, паўторныя таргі назначаюцца на маемасьць: Юнеса, Лошыцэра і Кагана ва 11 кастрычніка і Сіпа на 13 кастрычніка ў тыя ж часы, што і першы торг.

Са сьпісам маемасьці і парадкам продажу можна даведацца ў судовага выканаўцы па Пралетарскай вул. д. № 15 ад 9 да 12 гадзіны дню штодзённа, а ў дзень продажу на месцы торгу.

Судовы выканаўца ПАНКРАТ.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Вучотна конская кніжка, выд. Чэрвенскім вайсковым сталам у 1928 г., 2) чырвонаарм. кніжка, выд. Чэрвенск. вайсковым сталам у 1926 г. на імя Грынкевіча І. кв. 1245.

— Конская кніжка № 2629 Вочэры С., выд. Каралінскім РВК, кв. 1243.

— Вучотна конская кніжка № 417 Дворака А., Выд. Каралінскім РВК. кв. 1244.

— Каавэрац. кніжка № 4940 Касьцюковіч Т. Д., выд. Барысаўск. ЦРК, кв. 1246.

— Прыпісная кніжка дапрызыўніка Дайлідовіча А. А., выд. менакрезенкаматам, кв, 1251

— Сяброўская кніжка за № 418 Дуброўскага В., выд. с-гасп. т-вам і сыраўка Бібікоўскага с-савета, кв. 1277.

— Конск. карт. за № 161 Санько І., выд. Грэскім РВК, кв. 1278.

— Службова-вайсковая кніжка за № 558 Дуда Ф. выд. Каралінскім вайсковым сталом, кв. 1279.

— Паявая кніжка за № 1404 Суша П., выд. Чэрвенскім спаж. т-вам, кв. 1280.

— Два квіта за № 9412-9434 Прэдчэнка Д. К., кв. 1281.

— Вучотна-конская карт., выд. Чэрвенскім вайсковым сталом у 1924 г., 2) асабовае пасьведчаньне, выд. Чэрвенскім вайсковым сталом аб нягодзнасьці да вайсковай службы на імя Шамко А., кв. 1282.

— Дапрызыўная кніжка за № 91 Васькевіча І. Д., выд. баўш. Слабадзкім РВК, кв. 1283.

— Вайсковая кніжка Грака Б., выд Чэрвенскім вайскомым сталом, кв. 1284.

1-я дзяржаўная друкарня